

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСКАГА ГРАМАДСКА-КУЛЬТУРНАГА ТАВАРЫСТВА

№ 46 (1081) БЕЛАСТОК 14 ЛІСТАПАДА 1976 г. ЦАНА 60 гр.

28 лістапада пленум ГП БГКТ

28 кастрычніка г.г. адбылося чарговае пасяджэнне Прэзідыума Галоўнага праўлення Беларускага грамадска-культурнага таварыства. На ім быў абмеркаваны і зацверджаны даклад на пленум ГП БГКТ, які адбудзецца 28 лістапада г.г. Пленум прысвечаны будзе працы гурткоў у святле пастаноў VIII з'езду БГКТ.



Мелодыі Шапэна

Я іду за музыкай Шапэна,
Адкрываю радасці сама:
Скачуць іскры Віслы
белапеннай,
І мазурку скача ўся карчма.

Пэўна, ў дзіўных клавішах
раяля
Ёсць валынкі,
скрыпкі,
кантрабас.
Глянь, абэрак пары заскакалі,
Хто ж уседзець можа ў гэты час?

Раптам чую рэха барабана —
І няма канцэртных, мірных
сцен!
З рытмаў нечаканых,
палымяных
Малады выростае Шапэн.

Гэта ўжо не музыка, а цуда,
Болей струнам болю не стрываць:
Рытмы Гераічнага эцюда
Над варшаўскай восенню грымяць.

Ён каноны разрываў упэўнена
Выбухамі гора і трывог.
Там гучала музыка Шапэна,
Дзе Міцкевіч гаварыць не мог.

А галовы царскія не чулі,
Што ў мазурках тоіцца ўдар.
Што ў накцюрнах гневаліся кулі,
Ў паланезах — грозны марш фанфар!
У Парыжы гулкім
і ў Наане
Сніў ён Польшчу,
звон яе лугоў.
Ён дайшоў бы ўласнымі
нагамі
Да крутых зялёных берагоў!
Толькі б зноў пачуць,
як на радзіме
Журацца сялянкі
і пяюць,
Толькі б зноў сустрэцца з
дарагімі,
Мову незабыўную пачуць!
І таму
тужлівымі вачамі
Углядаўся ён, трывожны, ўдаль.
І таму
бяссоннымі начамі
Морам бушаваў яго раяль.

Эдзі Агняцвет

ПРАЗ ТЫДЗЕНЬ У „Ніве"

На відным месцы ● У Ніны Цыванюк ● У палоне забабонаў ● Гродзенскі медыцынскі ● Гаворкі Славяншчыны ● Незабыўная сустрэча ● Адказ Маланцы ● Міхась Зарэцкі ● На практыцы ў ліцэі ● Навошта кідаць у сваё акно? ● Весткі з Гарадка, Нараўкі, Бельска, Белавежы, Міхалова, Гайнаўкі, Пліпак, Ставішчаў, Нарвы, Тафілаўцаў, Чэхаў Арлянскіх, Шудзялава, Дубіч Царкоўных ● Калі сніцца злодзей ● Песня „Myśmy są wojsko".



Белавежа. Будынак ляснога тэхніку ма. *Фота Я. Цялушэцкага.*

АДКРЫЦЦЁ НОВАГА СЕЗОНА

„Добры пачатак — справы палавіна", — кажа народная прыказка. Яе вымову можна поўнасцю аднесці да вельмі ўдалай урачыстасці адкрыцця 1976/77 культурна-асветнага сезона ў дзейнасці Беларускага грамадска-культурнага таварыства.

Увечары 23 кастрычніка г.г. зала клуба ў будынку ГП БГКТ запоўнілася прыбыўшымі з розных мясцовасцей нашага ваяводства, а таксама з Варшавы і Беластока, вядучымі дзеячамі нашай арганізацыі, яе актывістамі, удзельнікамі мастацкай самадзейнасці, літаратарамі і журналістамі. Сваёй прысутнасцю прыдалі бляску вечарыне дырэктар аддзела ўнутраных спраў Ваяводскага ўпраўлення **Уладзіслаў Канстанчук,** прадстаўнік Ваяводскага камітэта ПАРП **Аляксандр Сеўка,** прадстаўнікі арганізацый і ўстаноў, з якімі звязвае БГКТ цеснае супрацоўніцтва. І бадай таму, што сабраліся разам людзі, якіх натхняе супольная ідэя грамадскай дзейнасці для дабра нашай культуры і асветы, увесь вечар панавала свойская сямейная атмасфера. Яе цеплыню і сардэчнасць узмацняла адчуванне ўсіх, што мінулы год быў адным з самых плённых на ніве дзейнасці нашай арганізацыі.

Гэтае пачуццё належна выкананай, хоць і нялёгкай працы пацвердзіў у сваім выступленні старшыня ГП БГКТ **Мікалай Самоцік.** Падкрэсліў ён, што ў нашай арганізацыі ў мінулым годзе была праведзена важкая ідэйная і арганізацыйная работа. Перад VIII з'ездам БГКТ у кожным гуртку прайшлі справаздачна-выбарныя сходы, на якіх абмяркоўваліся дырэктывы і матэрыялы VII з'езда ПАРП, а таксама дасягненні БГКТ і „Нівы" за XX год іх дзейнасці. Гэтыя сходы заўважальна ажывілі дзейнасць гурткоў, а ўсёй нашай арганізацыі прыбыло каля тысячы но-

Працяг на стар. 4

НАВАСАДАЎСКАЯ ФАБРЫКА МЯСА І ХЛЕБА

Калі пасля IV пленума Цэнтральнага Камітэта Польскай аб'яднанай рабочай партыі пачалася ў нашай краіне ўсенародная гутарка аб тым, як павялічыць пастаўку харчоў, ды асабліва мяса і мясных вырабаў, я перш за ўсё падумаў аб Навасадах. Тут за вёскай, схаваўшыся за маладым хвойнікам, на пясчаным пустыры раскінулася велізарная свінагадоўчая ферма, гаспадаром якой з'яўляецца мясцовая спулдзельня сельскагаспадарчых гурткоў.

— Што ў вас новага, цікавага? — звяртаюся да Сяргея Плевы, які кіруе гэтай фабрыкай мяса і хлеба.

— Што новага? Цікавага? — у задуменні паўтарае ён мае пытанні. — Наш тавар заўсёды аднолькавы — свініна і збожжа. Адно толькі стараемся, каб з кожным годам было яго ўсё больш і больш.

— І як вам гэта ўдаецца?

— Мяркуйце самі, — кажа кіраўнік і запрашае на прагулку па яго свінячым каралеўстве, межы якога пашыраюцца з кожным годам.

Гайнаўская і беластоцкая прамысловасць, як магутныя насосы, безупынку выцягваюць людзей з навакольных вёсак. Старэнькія бацькі, каб забяспечыць восень свайго жыцця, аддаюць гаспадаркі ў замен за пажыццёвую пенсію. Абавязак загаспадарыць пакінутую зямлю прыпадае тут спулдзельні сельскагаспадарчых гурткоў. Такім чынам у навасадаўскай СКР назбіралася ўжо 470 га зямлі.

— Гэта наш базіс для развіцця гадоўлі, — кажа кіраўнік Плева. — Мы не можам толькі азірацца на дзяржаўныя запасы кармоў. Ужо цяпер абяспечваем свае патрэбы ў звыш 70 працэнтах уласнымі кармамі. Асабліва дбайна адносімся да ўсялякіх зялёных кармоў. Адзін кілаграм зялёнкі з азімага паплёну каштуе ў нас ледзь 20-30 грошай, гэта самы танны корм.

На панадворку, у хлеўнях, пры машынах мітусяцца людзі. Разам звыш 60 чалавек, у тым ліку аж 30 трактарыстаў. Працавіты калектыў. Анатоль і Юрка Балтрамюкі — з адной сям'і. Юрка ў мінулым сезоне разам з давераным яму трактарам і снопавязалкай выпрацаваў амаль 200 гадзін. Гэта многа.

(Працяг на стар. 4)

У НАШЫХ САМАДЗЕЙНІКАЎ



Кадр з п'есы „Агледзіны" Бондарава ў выкананні беластоцкіх самадзейнікаў.

Фота Я. Цялушэцкага

ШТО НОВАГА?

Полымя над Басконіяй

Па закліку палітычных і прафсаюзных арганізацый працоўныя Краіны Баскаў правялі ў канцы верасня ўсеагульную забастоўку. Больш як паўмільёна рабочых, служачых, рыбакоў адмовіліся выйсці на работу і ўшанавалі памяць пяці баскскіх юнакоў, пакараных смерцю ў мінулым годзе франкісцкімі ўладамі. У правінцыях Гіпуска, Біскайя, Алава і Навара закрыліся ўсе фабрыкі і заводы, муніцыпальныя ўстановы, не дзейнічалі банкі і магазіны. Абязлюдзелі порты, спыніліся заняткі ў школах і вышэйшых навучальных установах. У розных гарадах баскскіх правінцый прайшлі масавыя маніфестацыі і мітынгі. Іх удзельнікі запатрабавалі неадкладнага аднаўлення дэмакратычных правоў, амністыі ўсім палітзняволеным, дазволу палітэмігрантам вярнуцца на радзіму, легалізацыі ўсіх палітычных і прафсаюзных арганізацый.

Праблема баскаў існуе ўжо не першы год. Прыйшоўшы да ўлады 36 гадоў назад, дыктатар Франка ліквідаваў аўтаномію Краіны Баскаў і ўзяў курс на „іспанізацыю" яе насельніцтва. Старажытная культура і мова гэтага народа падвяргаліся жорсткім ганенням. Было забаронена навучанне і выданне кніг на мясцовай мове, закрыты нацыянальныя газеты і часопісы.

Вастрыё рэпрэсій улады накіравалі супраць прыхільнікаў сацыяльных і палітычных перамен, і перш за ўсё супраць баскскага пралетарыяту. За сорак без малога гадоў франкісцкай ночы тысячы змагароў былі схоплены агентамі дыктатара, пасаджаны ў казематы або сасланы на катаргу. Аднак, стойка вытрымаўшы ўсе выпрабаванні, многія патрыёты-антыфашысты вырваліся з засценкаў і сёння зноў знаходзяцца ў першых радах барацьбітоў за новую, дэмакратычную Іспанію.

Аб'ектам асабліва жорсткага тэрору стала патрыятычная Асацыяцыя барацьбітоў за свабоду Краіны Баскаў (ЭТА). „Эўскадзі та аскатусана" — такая яе назва на баскскай мове — з моманту свайго стварэння нязменна выступала за звяржэнне франкізму і прадастаўленне аўтаноміі Краіне Баскаў. У яе радах нямала мужных, стойкіх і загартаваных байцоў, якія прайшлі суровую школу барацьбы ў падполлі, вытрымалі нечалавечыя катаванні ў засценках Франка. Аднак дзейнасць ЭТА ўскладняецца тым, што ў ёй няма поўнага адзінства па пытанню аб метадах барацьбы з франкісцкай спадчынай. Частка актывістаў ЭТА і пасля смерці дыктатара спрабуе змагацца з цяперашнім рэжымам шляхам адкрытага тэрору. Але яны ў меншасці. Большая частка членаў гэтай арганізацыі ў цесным супрацоўніцтве з камуністамі ўзнімаюць на бой за дэмакратычную Іспанію шахцёраў і металургаў, карабелаў і машынабудаўнікоў.

Мадрыдскія ўлады прыкладаюць нямала намаганняў да таго, каб ізаляваць барацьбу баскаў ад руху іншых антыфашысцкіх сіл. Аднак гэтыя спробы дарэмныя. Рашэнне ўрада А. Суарэса аб'явіць у воінскіх часцях, раскватараваных у Краіне Баскаў, становішча павышанай баявой гатоўнасці выклікала справядлівы гнеў і рашучы пратэст шырокай грамадскасці Іспаніі. У знак салідарнасці з патрабаваннямі баскаў каля пятнаццаці тысяч рабочых і служачых пошт і тэлеграфа 34 з 50 правінцый Іспаніі аб'явілі забастоўку.

Пазіцыя камуністаў у адносінах да праблемы баскаў зразумелая і недвухсэнсоўная. Гаворачы аб шляхах вырашэння нацыянальнага пытання ў будучай дэмакратычнай Іспаніі, Далорэс Ібарury ў адной са сваіх апошніх работ піша: Іспанскія камуністы лічаць, што „пасля франкізму палітычная будучыня краіны не можа быць простым вяртаннем да Іспаніі 1931 года, а павінна быць арганізацыяй федэратыўнай Іспаніі, у якой усе народы і вобласці, што валодаюць бясспрэчнай спецыфічнасцю, зноў набудуць сваю нацыянальную або рэгіянальную індывідуальнасць з усімі правамі, якія вынікаюць з гэтага".

Луіс Севано
(АДН)

Р. 27844

Год 1. Вильни 17/30 листопада (ноября) 1906 г. № 2.

Наша Нива

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА З РЫСУНКАМИ

ВЫХОДЗИЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ рускими и польскими литэрами.

Адрэс рэдакцыи и администрацыи: Вильня, Большая Погулянка д. № 17.

Цэна асобнаго нумэру 5 кап.

Наш каляндар

З ВЕРАЙ У СВЕТЛУЮ ПРЫШЛАСЦЬ

„Калі ў памятны 1905 год зрабілася завіруха, калі ў Расіі ў кожнага чалавека будзіцца душа да новага жыцця, да новага шчасця, — то і ў беларуса будзіцца стала пачуццё свайго „я", стала лунаць доўга дрэмлючая думка, што і мы — людзі", — пісаў Янка Купала ў 1913 годзе ў „Нашай ніве", даючы трапны адказ на пытанне, якія былі крыніцы паўстання беларускага пісьменніцтва ў пачатку XX стагоддзя.

Калі 1 верасня 1906 г. у Вільні пачала выходзіць першая беларуская легальная газета „Наша доля", царскія чыноўнікі сустрэлі яе ў штыкі і за бунтарскі змест і за беларускую мову на 6 выйшаўшых яе нумароў канфіскавалі аж 5. Для тагачаснай беларускай інтэлігенцыі, якая ўзяла на сябе ўсе непамерныя цяжкасці стварыць легальны беларускі друк, стала ясна, што дні „Нашай долі" палічаны, і пачала рабіць намаганні, збіраць дабравольныя складчыны і ахвяраванні, каб адкрыць новую беларускую газету. І вось **10 лістапада 1906 года выйшаў у свет першы нумар другой беларускай легальнай газеты „Наша ніва"**. У студзені 1907 г. „Наша доля" рашэннем Віленскай судовай палаты канчаткова ліквідавана, і тады „Наша ніва" на доўгі час стала адзінай трыбунай усіх тых інтэлектуальных сіл Беларусі, якія, як толькі змаглі, аддавалі ўласныя таленты на службу свайму паднявольнаму народу.

Абапіраючыся перш за ўсё на просты беларускі люд і знаходзячы маральную падтрымку прагрэсіўнай рускай і польскай творчай інтэлігенцыі, „Наша ніва" з бегам часу пачала адыгрываць вядучую ролю ў абуджэнні нацыянальнай свядомасці беларускага народа. На яе старонках развівалася і даспявала творчасць такіх волатаў нашага роднага беларускага слова і грамадскага дзеяння, як Я. Купала, Я. Колас, М. Багдановіч, Ц. Гартны, З. Бядуля, А. Пашкевіч-Цётка і шэрагу іншых — самага цвету нашай літаратуры першай паловы XX стагоддзя. Амаль цэлыя 9 год, аж да 7 жніўня 1915 г., калі пад Вільню падышлі войскі нямецкага кайзера і ўжо не было магчымасці выдаваць газеты, штотыдзень несла „Наша ніва" пад саламяныя стрэхі вёсак і мястэчак беларускай зямлі розныя весткі, артыкулы аб балючых для працоўных справах, папулярна-навуковыя публікацыі, вершы, апавяданні, сакавіты гумар. І знаходзіла яна цёплы водгук па ўсёй Беларусі. Сотні карэспандэнтаў дасылалі для яе цікавыя весткі аб жыцці ў сваіх родных ваколіцах, у тым ліку і таямнічыя „Янка а па бацькаві Кастусёў" ды „Грыбок" і „Каршун" з Гарадка, „Сваяк з-пад Крынок", „Ю. М." з Супраслі і іншыя з розных мясцовасцей тагачаснай Беласточчыны.

І споўніла „Наша ніва" сваю велічную місію ў гісторыі народа...

Іменна гэта меў на ўвазе Я. Купала — апошні галоўны рэдактар „Нашай нівы" — калі ў 1940 годзе пісаў: „Мы былі разам з народам, гнеўна бунтавалі разам з ім, верылі ў будучыню. Кропля таго вялікага святла, якое цяпер напаўняе ўсё наша жыццё, свяціла нам з будучыні тады, надавала бадзёрасці і веру ў лепшую светлую прышласць". (іс)



ПОМНІКІ ЗЯМЛІ БЕЛАРУСКАЙ. Помнік загінуўшым воінам і партызанам у Бераставіцы Гродзенскай вобласці.

УЗНАГАРОДЫ

З нагоды адкрыцця новага культурна-асветнага сезона шэрагу дзеячам і працаўнікам Беларускага грамадска-культурнага таварыства і тыднёвіка „Ніва" прызнаны ўзнагароды.

Міністэрства культуры і мастацтва прысвоіла званне „Заслужаны дзеяч культуры" сакратару рэдакцыі тыднёвіка „Ніва" **Адзе Чэчуга** і мастаку-афарміцелю нашага часопіса **Стэфану Рыбі.**

Прэзідыум Галоўнага праўлення БГКТ за заслугі для нашай арганізацыі ўзнагародзіў памятным медалем „XX год БГКТ" **калектыў працаўнікоў рэдакцыі „Ніва"**, а таксама індывідуальна наступныя асобы: **А. Амбражэй, М. Гайдука, У. Куршаля, А. Мартыновіча, К. Масальскага, Н. Мушынскую, Г. Мялешка, С. Трахімюка, К. Хлябіча, Н. Цыванюк і С. Шыманюка.**

Дыпломы з падзякай за самаахвярную дзейнасць у радах нашай арганізацыі Прэзідыум ГП БГКТ прызнаў наступным асобам: **М. Гайдуку, К. Масальскаму, Н. Мушынскай, І. Паўлючук, Я. Рашкевічу і Н. Цыванюк.** (іс)

TELEWIZJA WARSZAWA

Sobota — 13.XI. 6.00 RTV Szk. Śred. Mat. 6.30 Biolog. 7.00 Tech. Rol. Fiz. 7.30 Upr. rośl. 8.50 Red. szk. zap. 9.00 Koncert Gal. Fest. Zesp. Pieśni i Tańca „Zielona Góra" 76. 10.00 Dla szkół: Zoolog. kl. VII Robaki pasożyt. 10.30 Studio 2.

≈≈≈

Niedziela — 14.XI. 6.30 Tech. Rol. Fiz. 7.00 Upr. rośl. 7.30 Kurs Rol. 8.05 Przyp., radz. 8.15 Now. w domu i zagr. 8.40 Sport dla wszyst. 8.45 Sport. 9.00 Teleranek. 10.20 Antena. 10.45 W starym kinie. 12.00 Dziennik. 12.20 Piórkiem i węglem. 12.45 75-lecie Filharmonii Narod. 13.55 Dla dzieci. 14.50 Między nami jaskiniowcami — film anim. 15.15 Los. Duż Lot. 15.30 Wielkie bitwy historii — Bitwa pod Orleanem — film dok. 16.30 Sport. 18.00 Tele-Echo. 19.00 Wieczorynka. 19.30 Dziennik. 20.40 Bajka dla dor. 20.50 Wojna i pokój — film ser. 21.40 L. Kydryński przedst. Zizi Janmaire. 22.40 Sport.

≈≈≈

Poniedziałek — 15.XI. 12.45 RTV Szk. Śred. J. pol. Lit. sarmacka. 13.25 Fiz. 15.50 NURT. 16.25 Pr. dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 Obiektyw. 17.00 Zwierzyniec. 17.40 Siedemnaście mgnień wiosny — film ser. 19.00 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.40 Teatr TV: J. Szaniawski „Most". 21.50 Operowe qui pro quo. 22.55 Dziennik.

≈≈≈

Wtorek — 16.XI. 6.00 RTV Szk. Śred. J. pol. Lit. sarmacka. 6.30 Fiz. 9.00 Dla szkół: J. pol. kl. VI W. Katajew. Samotny biały żagiel. 10.00 Wojna i pokój — film ser. ang. 12.00 Dla szkół: Hist. kl. VIII W latach kryzysu i depresji. 13.45 Tech. Rol. J. pol. B. Prus. 14.30 Mech. rol. 16.25 Pr. dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 Obiektyw. 17.00 Przyp., radz. 17.05 Studio Mł. 17.55 Świat i Polska. 18.30 Komicy niemego ekranu — film arch. 19.00 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.40 Filmy Bergmana: Jak w zwierciadle. 22.15 Dziennik.

≈≈≈

Środa — 17.XI. 6.00 Tech. Rol. J. pol. B. Prus. 6.30 Mech. rol. 7.30 Jak w zwierciadle — film fab. szw. 9.00 Dla szkół: Chem. kl. VII Wróg metali. 10.00 Hist. kl. V Złoty Wiek Aten. 11.05 Fiz. kl. VIII Elektrony. 12.45 Chem. 13.25 Tech. Rol. Upr. rośl. 15.50 NURT. 16.25 Pr. dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 Obiektyw. 17.00 Dla dzieci. 17.30 Los. Mał. Lot. 17.55 Lekt. Pegaza. 18.10 Sport. 19.00 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.40 Rodzina Lubowimych — film fab. radz. 22.10 Dziennik. 22.25 Sport.

≈≈≈

Czwartek — 18.XI. 6.00 RTV Szk. Śred. Chem. 6.30 Tech. Rol Upr. rośl. 9.00 Dla szkół. J. pol. kl. I lic. Pieśni Czarnoleskie. 10.00 Rodzina Lubowimych — film fab. radz. 13.45 Tech. Rol. Fiz. 14.30 Upr. rośl. 16.25 Pr. dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 Obiektyw. 17.00 Przyp., radz. 17.05 Dla mł. widzów. 18.10 Poligon. 18.30 Konsylium cz. I. 19.00 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.40 Teatr Sensacji — Morderstwo odkrywa prawdę. 22.15 Pegaz. 23.00 Dziennik. 23.15 Konsylium cz. II.

≈≈≈

Piątek — 19.XI. 6.00 Tech. Rol. Fiz. 6.30 Upr. rośl. 9.00 Dla szkół: Geogr. kl.V — Nad Morzem Śród. 10.00 kl. VI W Tatrach. 11.05 Wych. ob. kl. VII Now. w zakładzie prod. 12.45 RTV Szk. Śred. Mat. 16.25 Pr. dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 Obiektyw. 17.00 Pora na Telesfora. 17.50 Dla mł. widzów. 18.00 Inf. Wyd. 18.10 Z serii: Opowieści o tajemnicach morza — odc. I pt. Wypad w głębinę. 19.00 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.40 Noc w mieście — film TVP. 21.20 Teatr Komedii: M. Weliczkow — Tak piękne jak prawdziwe. 22.10 X Y Z cz. I. 22.50 Dziennik.

ТЭЛЕВІЗІЯ МІНСК

Piątek 12.XI — 17.15 Hokej. Czechosł. — ZSRR. 2 i 3 terc. 19.30 Koncert. 20.30 Filmy anim. dla dor.

Sobota 13.XI — 17.20 Koncert zesp. pieśni i tańca MWO. 17.45 Film fab. ser. 19.30 Hokej. Czechosł. — ZSRR.

Niedziela 14.XI — 11.30 Film fab. 14.55 Filmy anim. 15.30 Piosenka — 76. 16.15 Klub film. 17.20 Film fab. ser. 19.30 Koncert. 20.15 Puchar europ. mistrz. w p. wodnej. Półfinał.

КІНО

Białowieża Śluby kawalerskie — radz. 16—17. To niemożliwe — radz. 18—19. Siedem nianiek — radz. 20—21.

Bielsk Podl. Premia — radz. 15—16. Ta jedyna — radz. 17—18.

Czeremcha Aleksander Newski — radz. 16—17. Normandia Niemen — radz. 20—21.

Czyże Rezydent wywiadu — radz. Porucznik jazdy — radz. 17—21.

Dubicze Cerkiewne Po latach — radz. Nikt nie chciał umierać — radz. 17—21.

Gródek Śluby kawalerskie — radz. 20—21.

Hajnówka Wąwóz zapomnianych baśni — radz. 15—16. Premia — radz. 17—18. Kalina czerwona — radz. 19—20. Płonąca tajga — radz. 21.

Kleszczele Gracz — radz. 16—17. Wołga—Wołga — radz. 18—19. Premiera — radz. 20—21.

Michałowo Matczyne serce — radz. 16—17. Jakow Bogomołow — radz. 18—19. Brylantowa ręka — radz. 20—21.

Mielnik Ostatni lot — radz. 17. Ogień na oceanie — radz. 20—21.

Milejczyce Gwiazdy w morzu — radz. 16—17. Tajemniczy mnich — radz. 18—21.

Narew Człowiek bez paszportu — radz. Wiryneja — radz. 17—21.

Narewka Dzieci Don Kichota — radz. Staroświecki dramat — radz. 17—21.

Nurzec Szach królowej brylantów — radz. 16—17. Dwója z wychowania — radz. 18—19. Afonia — radz. 20—21.

Orla Rzeka płynie dla zakochanych — radz. Chewsburska ballada — radz. 17—21.

Rajsk Mroźny poranek — radz. Ostatni lot — radz. 17—21.

B.Z.Graf. Zam. 2613 F-4

У ПАВІЛЬЁНЕ З СУВЕНІРАМІ

Выехаць з Белавежы, не купіўшы нейкую памятку, — гэта не змяшчаецца ў галаве амаль ніводнага экскурсанта ці турыста. Што ж, зусім зразумела. Самі, калі кудысьці паедзем, заўжды нейкую дробязь прывозім на памяць.

Павільён з сувенірамі быў адчынены ў Белавежы 10 чэрвеня 1973 г. па ініцыятыве кіраўніка мясцовага бюро ПТТК Уладзіслава Ляпруса. Спачатку прадавалі ў год тавару на 400-500 тыс., цяпер ужо на 700 тыс. Прадавалася б намнога больш, ды вытворцы не паспяваюць дастаўляць свае вырабы. Зрэшты, ПТТК моцна і не націскае на колькасць тавараў: лепш менш, затое лепш, лепшай якасці.

Калі ў прыватных ларках царыць халтура, у павільёне прапануюць вырабы, характарызуючыя нядрэнны мастацкі густ і творцаў. Увайшоўшы за дзверы крамы, невядома, на што спярша глядзець. У многіх з вуснаў вырываецца енк захаплення.

— Чаго прадаеце тут найбольш? — пытаю ў прадаўшчыцы Марыі Баланкоўскай, якая вядзе краму ад яе адкрыцця.

— Цяжка акрэсліць, — адказвае яна, — нішто ў нас доўга не залежваецца. Найбольшае запатрабаванне ёсць, бадай, на зуброў, выкананых у драўніне. Дастаўляюць іх нам звычайна Шума, Ахрымюк, Калмыкоў і Вашкевіч — тутэйшыя творцы. Іх зубры падабаюцца турыстам. Яны стаяць на паліцы ўсяго некалькі гадзін, хаця цэны розныя — ад 160 зл. да 2 тыс. зл. Таксама падабаюцца зубры, адлітыя ў гіпсе. Цана 45 зл. за штуку. Яны зусім падобныя на тых, што зроблены ў дрэве. Вырабляе іх В. Мінкевіч. Сапраўдны фурор выклікаюць вырабы з карэнняў дрэў С. Банаха (арыгінальныя падсвечнікі, абажуры, падстаўкі для кветак, вазачкі і інш.). Не менш папулярныя талеркі з наклеенымі кветкамі Гапановічавай з Беластока (цана 130-200 зл.). Многа прадаю розных прыгожых кулонаў, нашыйнікаў, брошак, драўляных шкатулак, гравюраў на дрэве або кары. Турысты часта купляюць таксама гліняныя збанкі („сівакі“) ганчара Л. Саласцюкевіча з Кляшчэляў. І наканец трэба ўспомніць пра зуброўку (дастаўляе яе нам прадпрыемства „Ляс“ з уласных плантацый), якую прадаю ў пучках па 4 зл. Яна ідзе ў вокамгненне.

Павільён з памяткамі размешчаны ў самым цэнтры Белавежы. Гэта таксама вялікі яго козыр.



У павільёне прадае Марыя Баланкоўская.

Тэкст і фота
Пятра Байко

Беларусіяна

Школа ў нявол!

Юрый Туронак вядомы нашаму чытачу не толькі як актыўны дзеяч варшаўскага гуртка і навуковага гуртка БГКТ, але таксама як нястомны даследчык школьніцтва ва ўсходняй частцы Беласточчыны. Яго пяру належыць шэраг артыкулаў на гэтую тэму ў „Ніве“, а таксама „Нарыс развіцця школьніцтва на Беласточчыне ў перыяд 1773-1939 гг.“, які змешчан у „Навуковым зборніку“, выдадзеным у 1974 г. Беларускім грамадска-культурным таварыствам і Беластоцкім навуковым таварыствам.


Цяпер жа ў часопісе „Przegląd Historyczno-Oświatowy“ № 3 (73) за 1976 г. паявіўся артыкул Ю. Туронка **„Акупацыйная школьная палітыка ў Беластоцкай акрузе (1941-1944)“.** У ім аўтар знаёміць чытача з асноўнымі прынцыпамі асветнай палітыкі гітлераўскіх акупантаў на запалоненых усходніх землях з асаблівай увагай да Беласточчыны, дзе таксама абавязвала ўказанне Гімлера і Гітлера: *„Для ненямецкага насельніцтва Усходу не можа быць вышэйшых школ, як чатырохкласнае народнае вучылішча. Мэтай такой школы мае быць выключна: простае лічэнне сама болей да 500, напісанне прозвішча, павучанне, што божай воляй з'яўляецца быць паслухмяным немцам, сумленнасць, пільнасць і ветлівасць. Чытанне ўважаю неабавязковым“.* Але насельніцтва Беласточчыны, як толькі здолела, ратавала маладое пакаленне ад ператварэння яго ў цёмных і пакорлівых нямецкай „панскай расе“ нявольнікаў. Рознымі паўлегальнымі спосабамі арганізоўвала на свой кошт школкі, і дзякуючы ахвярнасці і адвазе настаўнікаў, што часта працавалі запаўдарма, дзеці і моладзь нелегальна атрымоўвалі значна вышэйшыя і глыбейшыя веды, чым прадбачвалі акупанты. Аўтар паказвае таксама і розныя змены ў гітлераўскай „асветнай“ палітыцы на нашых землях, між іншым, імкненні пасеяць варожасць паміж беларускім і польскім насельніцтвам.

Артыкул напісаны ў асноўным на ўспамінах настаўнікаў, якія вучылі ў часе акупацыі, вясковых актывістаў, што ўдзельнічалі ў арганізаванні навучання, былых вучняў старэйшых класаў. Абшырныя і падрабязныя табліцы, вельмі старанна апрацаваны матэрыял адносна крыніц. Усё гэта робіць артыкул Ю. Туронка каштоўным укладам у навейшую гісторыю школьніцтва на Беласточчыне.

(іс)

МІНІ-ІНТЭРВ'Ю СА ЗДЫМКАМ

Песня запаланіла



Гэтую размову з **Оляй Амельянчук** — сімпатычнай спявачкай з беларускага хору з Плёскаў — мне ўдалося правесці ў часе кароценькага перапынку паміж двума канцэртамі, што 10 кастрычніка 1976 г. давалі калектывы з Гарадка, Дубяжына і Плёсак у гайнаўскім Доме культуры „Гурнік“.

— Калі вы пачалі спяваць?

— Яшчэ ў пачатковай школе. Заахвоціла нас, вучаніц VIII класа, настаўніца спеваў А. Мартынюк. Спачатку выступілі мы на павятовым аглядзе конкурсу „Беларуская песня“ для школьнікаў, потым на павятовых і раённых элімінацыях конкурсу на савецкую песню. І песня нас запаланіла. Пасля заканчэння пачатковай школы я стала спяваць у калектыве, якім кіравала В. Леанюк. Якія ж цудоўныя выступленні мы давалі! Аж прыемна ўспомніць. Потым настaлі для нас цяжкія часы: не было кіраўніка і спявалі мы, як умелі і што ўмелі. Цяпер жа нам з нашым кіраўніком Пятром Нявінскім працуецца вельмі добра.

— І з якімі вынікамі?

— Нядрэннымі. Дзе ўжо мы толькі не выступалі! Усю Беласточчыну з песнямі аб'ехалі ды і ў конкурсах „Беларуская песня“, савецкая песня, калядная, проціпажарная і іншых прымалі ўдзел. І ўзнагарод перабралі таксама нямала: праігрывацель, міксер, млынок для кавы, сокавыжымалку, камплекты для торту і многа іншага. Але самай каштоўнай для нас узнагародай заўсёды было і ёсць задавальненне слухачоў ад нашага выступлення.

— Працуеце ці вучыцеся?

— І адно і другое. Працую разам з бацькамі на гаспадарцы, кантрактуем збожжа, гадуем кароў, свіней, авечак. Работы ёсць шмат, але я яе люблю. І школу сабе выбрала таксама ў гэтым жа кірунку: вучуся на завочным аддзяленні сельскагаспадарчага тэхнікума ў Бельску. Цяпер я ўжо на чацвёртым семестры. Навука ідзе добра. Найбольш люблю прадметы па сельскай гаспадарцы: вырошчванне сельскагаспадарчых раслін, гадоўлю жывёлы, а пабойваюся матэматыкі. Пасля заканчэння тэхнікума хацела б заняцца гадоўляй.

— Якіх спевакоў найбольш любіце?

— Перш за ўсё Анну Янтар, затым Ірэну Яроцкую, а сярод калектываў — чароўную „Аббу“ і савецкі „Поющие гитары“. Наогул люблю тых, хто спявае з пачуццём, з сэрцам, — сказала яна мне і пабегла на сцэну, бо якраз пачыналася выступленне плёскаўскага калектыву.

Ігнат Снарскі
Фота аўтара

Беларускія кнігі

У кнігарні імпартных выданняў у Беластоку, вул. Кілінскага 10, можна набыць наступныя кнігі на беларускай мове:

Калодзежны Л., Аўсяны звон, 1975, стар. 128, цана 1 зл. 90 гр.

Першая кніжка апавяданняў і мініяцюр пісьменніка, асноўнай прафесіяй якога з'яўляецца прыкладное мастацтва. У яго творах чытач знойдзе каляровы свет фарбаў і арыгінальнасць падыходу да акружаючай рэчаіснасці.

Тихомиров М. Н. Древняя Русь, 1975, стар. 430, цана 21 зл.

Зборнік артыкулаў выдатнага савецкага гісторыка аб праблемах фарміравання і развіцця феадальных адносін у Старажытнай Русі, яе месцы і значэнні ў міжнародных адносінах таго часу і гісторыі рускага, украінскага і беларускага народаў. Асабліва варта звярнуць увагу на абшырнае даследаванне „Сялянскія і гарадскія паўстанні на Русі XI — XIII ст. ст.“.

Курган Славы, 1975 цана 3 зл.

Прыгожы фотаальбом з каляровымі здымкамі аб самым вядомым, манументальным помніку ў гонар перамогі савецкага народа над фашызмам. Помнік знаходзіцца каля Мінска.

Кнігарня ахвотна высылае кнігі за паштовым залічэннем. Запатрабаванні накіроўвайце па адрасу:
„Dom Książki”, 15-089 Białystok, ul. Kilińskiego 10.

(мг)

Хроніка

■ Нядаўна на ўрачыстасці адкрыцця новага культурна-асветнага года ў Гайнаўцы дзеяч БГКТ Віктар Бура атрымаў грашовую ўзнагароду ад начальніка горада Анатоля Гіншта.

■ 19 кастрычніка на пасяджэнні праўлення гайнаўскага гарадскога гуртка (старшыня Васіль Сакоўскі) быў прыняты план працы на асенне-зімовы перыяд.

■ 22 кастрычніка ў памяшканні ГП БГКТ адбылася сустрэча з пяціасабовай дэлегацыяй дзеячоў культуры Гродзеншчыны на чале з начальнікам Аддзела культуры абласнога выканаўчага савета Аляксандрам Лысковым, якая цікавілася працай нашай арганізацыі.

■ 24 кастрычніка харавы калектыў з Дубяжына і эстрадная група з Плёсак пад кіраўніцтвам Пятра Нявінскага далі канцэрт у Міхалове і Трасцянцы.

■ 24 кастрычніка Галоўнае праўленне БГКТ для сваёй лектарскай групы арганізавала семінар на тэму „Сацыялістычная сям'я“. Даклад падрыхтаваў член Прэзідыума ГП Вінцук Склубоўскі.

■ Усе члены гурткоў БГКТ у Семяноўцы і Плянце (гміна Нараўка) у 100% аплацілі членскія складчыны за бягучы год.

М. Х.

Ад родных ніў

ЧЫТАЙЦЕ „НІВУ“!

Як жа на свеце сумна было б,
Каб не хадзіла „Ніва“ кругом.
„Ніва“ на вёсцы, „Ніва“ у месці,
Чытаюць „Ніву“ старыя й дзеці.

Бо як патрэбнае кветкам сонца,
Патрэбна „Ніва“ нашым сэрцам.

У „Ніве“ крытыка, у „Ніве“ весці,
І як зварыці, як хочаш есці,
Усе Гаспадыня спосабы знае,
А сны Астрон табе разгадае.
Сэрцайка любага прызаве,
Звонкая песня ў неба ўзаўе.

„Ніву“ чытайце, з „Нівы“ спявайце,
Будзьце здаровы, „Ніву“ чакайце!

Тыдзень праходзіць, час уцякае,
„Ніва“ зноў ў хаце нас усіх вітае.

Каб не газета ды весткі новы,
То мы б забыліся роднае мовы.
А як абідна было бы жыці,
Каб роднай мовай не гаварыці.

Люба Саковіч,
Юшкаў Груд

Пачатак на стар. 1

АДКРЫЦЦЁ НОВАГА СЕЗОНА

вых членаў. Працавіта і плённа прайшоў VIII з'езд нашай арганізацыі, яго высока ацанілі партыйныя і дзяржаўныя органы нашай краіны. Правялі мы шмат самых разнастайных па формах, насычаных глыбокім ідэйным і выхаваўчым зместам культурна-асветных мерапрыемстваў. Прыгадаем, для прыкладу, хоць некаторыя з іх: навукова-папулярную сесію для вузкага кола спецыялістаў і шматтысячныя народныя фэстыны, літаратурны конкурс для жменькі „белавежцаў“ і папулярныя конкурсы „Беларуская песня“ для дарослых і моладзі з удзелам дзесяткаў выканаўцаў і сотняў слухачоў, урачыстыя пасяджэнні ў гуртках і чытальніцкі конкурс, у якім прыняло ўдзел болей дзвюх соцень чалавек і многа іншых мерапрыемстваў. Нашыя калектывы далі дзесяткі канцэртаў на розных урачыстасцях у вёсках, мястэчках і гарадах, літаратары — дзесяткі аўтарскіх спатканняў з чытачамі ў школах і вясковых клубах. Словам, гэта быў шчодры год. Такі ж размах у дзейнасці патрэбен нам і ў наступіўшым новым культурна-асветным сезоне. Адначасова з пашырэннем форм працы з папярэдніх год будзем уводзіць новыя мерапрыемствы, між іншым, дэкламатарскі конкурс для школьнай моладзі і конкурс па жывапісу для дарослых. Хочам таксама, каб у конкурсе „Беларуская песня“ прыняло ўдзел як мага болей народных спевакоў, якія яшчэ не выступалі ў ім. Большую актыўнасць павінны праявіць нашыя гурткі ў развіцці тэатральных калектываў. Патрэбна большая аператыўнасць і нашай лектарскай групы. Улюбёнасць у прыгажосць роднага беларускага слова, глыбокія веды па беларускай літаратуры, добрыя пастаноўкі п'ес, цікавыя даклады, захапляючыя вершы і апавяданні, прыгожыя карціны і любыя нашаму сэрцу песні — вось чаго чакаюць ад нас людзі і мы па меры нашых магчымасцей будзем імкнуцца задаволіць іх запатрабаванні.

Лагічным працягам выступлення было ўручэнне М. Самоцікам значнай групе актывістаў і ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці прызнаных ім Прэзідыумам ГП БГКТ памятных медаляў, адчаканеных у сувязі з ХХ-годдзем нашай арганізацыі, і спецыяльных падзячных дыпломаў. Яны — сімвал прызнання, высакароднай дзейнасці, сімвал, які людзі прынялі з асаблівай пашанай.

І вось у зале паліліся песні — беларускія, польскія, рускія, украінскія. Пераспеўваліся імі паміж сабою па-народнаму звычаю калектывы з Гарадка, Дубяжына, Беластока, бы „агулькамі“-вяснянкамі пераспеўваюцца дзяўчаты ў цёплы майскі вечар у сёлах недзе каля Нарвы ці Кляшчэляў. Чароўная гэта гульня! А ў перапынках паміж песнямі нашыя паэты Алесь Барскі і Віктар Швед дэкламавалі свае вершы і з цэлым сольным канцэртам выступіў Аляксандр Раманюк з Дубяжына. Потым дапазна танцавалі і моладзь і старыя.

Усё гэта плыло стыхійна і натуральна, прывольна і заканамерна, як уся культурна-асветная дзейнасць Беларускага грамадска-культурнага таварыства, якой на гэтым вечары давалася высокая ацэнка за мінулы год і адкрываўся добры пачатак для новага сезона.

І. Снарскі

ДАРОЖНЫЯ ПАРТРЭТЫ



І малыша зацікавіў макет сучаснай аборы на сельскагаспадарчай выстаўцы. *Фота Я. Цялушэцкага*

НА СПАРТЫЎНАЙ НІВЕ

ВЫКЛІК УСЯМУ СВЕТУ

Стаер з Аўстраліі Джордж Падон кідае выклік любому лёгкаатлету свету: ён згодны памерыцца з ім сіламі на дыстанцыі, даўжэй за якую не прабягаў чалавек. Падон прапанаваў правесці забег вакол Аўстраліі даўжынёй у 19200 кіламетраў, пачаўшы яго ў Мельбурне ў маі 1977 года. Каб пакрыць такую вялікую адлегласць, піша газета „Геральд“, спатрэбіцца каля васьмі месяцаў.

Цяпер 52-гадовы спартсмен трэніруецца, прабягаючы штодзённа ў сярэднім 35 кіламетраў. „Не магу ўявіць, хто мог бы перамагчы мяне“, — заявіў ён.

Навасадаўская фабрыка мяса і хлеба

(Працяг са стар. 1)

— А іх маці, — інфармуе кіраўнік, — Анастасся Балтрамюк, таксама цесна звязалася з намі, бо падпісала яна шматгадовую ўмову на пастаўку парасят для нашай фермы. У год купляем ад яе каля 200 парасят, падкормленых больш-менш да 40 кг жывой вагі.

Гэта тут афіцыйна называецца кааперацыяй. Дае яна падвойную карысць. СКР мае гарантаваны жывы матэрыял для далейшага адкорму ў прамысловых маштабах, а вясковы гадоўца не абыякі даход, бо пры цяперашніх цэнах за адно парася гаспадар бярэ каля 2 тысяч злотых, а за 200 штук...

У даўжэзных хлеўнях аж кішыць ад крыклівых парсюкоў. Цяжка палічыць, колькі іх тут. Вядома толькі, што ў мінулым, значыць у 1975 годзе, з навасадаўскай фабрыкі мяса паступіла на бойню 134 тоны жывой масы. А ў гэтым годзе такую ж колькасць свіней даставілі яны ўжо на працягу ледзь шасці месяцаў.

—А ў недалёкай будучыні, — кажа кіраўнік, — будзе яшчэ больш, бо да канца 1980 года пабудуем тут яшчэ чатыры новыя хлеўні.

Далучаецца да нас Пётр Лапінскі. За ім адзінаццацігадовы вопыт працы ў Навасадах. На яго вачах здзяйсняліся тут усе перамены: ад сельскагаспадарчага гуртка з невялікім запасам тэхнікі, праз МБМ і да цяперашняй СКР з яе жывёлагадоўчым размахам і адкрытымі планамі на будучыню.

Пятра Лапінскага, які цяпер з'яўляецца наместнікам кіраўніка, ведаюць тут усе і ён таксама ўсіх ведае, бо гэта чалавек з адкрытым сэрцам на справы іншых людзей. Радны гайнаўскай гміннай рады і актывіст мясцовага гуртка ЗСЛ. Так пра яго гаворыць кіраўнік Плева. А яшчэ дадае, што Пётр Лапінскі заваяваў у рабочага калектыву сапраўдны аўтарытэт і давер. Пытаю яго, як гэта здарылася, а ён замест адказу на маё пытанне, гаворыць аб патрэбах сваіх сяброў па працы.

— Мы тут за вёскай прадукуем хлеб і мяса, — кажа ён. — Праца ў нас цяжкая. Прыдаўся б нам нейкі спажывецкі кіёск. Звярталіся мы па гэтай справе ў гайнаўскі ГС. На жаль, без выніку. Добра было б таксама, каб ПКС ля нашай базы наладзіў прыпынак. Да нас на работу многа людзей прыязджае з навакольных вёсак. Навошта ім ісці так далёка да прыпынку, калі аўтобус мог бы спыняцца ля самай брамы, дзе яны працуюць.

Гэта, так мне здаецца, зусім памяркоўныя патрабаванні, бо ў навасадаўскай СКР людзі сапраўды цяжка працуюць, асабліва восенню і зімой, калі дакучае холад. У будучыні, праз дватры гады, будзе тут свая сталовая з гарачымі абедамі для 80 чалавек, будзе святліца і санітарныя абсталяванні з гарачым душам. А пакуль што навасадаўскаму калектыву свінаводаў трэба памагчы. Гэтай дапамогі спадзяюцца яны перш за ўсё ад мясцовых гайнаўскіх улад.

М. Нурэцкі

З каромыслам па ваду



Саня Макаль з Паўднёвага Вострава выцягвае ваду з калодзежа.

Вада — непаўторнае прыроднае багацце, без якога немагчымае жыццё. Без вады не зробіш яды. Без вады нічога не вырасце. Без вады не будзе аніякай прамысловасці.

На нашых вёсках вада бярэцца з-пад зямлі, фільтруецца натуральным грунтам. У яе складзе многа мінеральных солей, і таму вада з вясковага калодзежа смачнейшая, чым з гарадскога крана. Але пакуль што на вёсцы трэба па ваду ісці пераважна па некалькі дзесяткаў метраў, трэба выцягваць яе часам з даволі вялікай глыбіні і прынесці ў руках на свой панадворак або ў хату. Аблягчае нашэнне вады каромысла, — простая прылада, а цяжар поўных вёдзер ужо не ў руках, а на плячах чалавека.

У Паўднёвым Востраве (гміна Крынкі) у далёкім мінулым, як аб гэтым расказвалі дзяды сённяшнім нашым дзядулям, былі амаль у двухкіламетровай вёсцы толькі два калодзежы — адзін за гародамі, каля Жамайдоў, другі на даліне, каля Радалёў. Тады схадзіць па ваду да калодзежа — для многіх гаспадароў, пражываючых далей ад калодзежа, было не простай справай.

Цяпер у Паўднёвым Востраве многа калодзежаў. Адны ў лепшым стане, другія — у горшым. Вось нядаўна калодзеж каля Бярнацкіх заваліўся, патрабуе неадкладнага рамонту. Калодзежная суполка паасобных гаспадароў рыхтуецца да яго.

Тэкст і фота **М. Хмялеўскага**

Беларуская літаратура

Аляксандр Баршчэўскі

НАШАНІЎСКАЯ ПАРА

АЛЬБЕРТ ПАЎЛОВІЧ — ЧАСТКА XX

Гумарыстычная плынь. Феміністычны камізм. У гумарыстычнай творчасці Паўловіча знаходзім значную колькасць вершаў, у якіх праяўляюцца жаночыя матывы. Некаторыя з такіх вершаў былі ўжо разгледжаны. Сёння зоймемся толькі тымі, у якіх жанчыны з'яўляюцца адзінымі або галоўнымі героямі. Да такіх твораў належаць: „Прыйшла ў цэркву раз бабулька“, „Гаспадыніна дзежа“, „З падслуханага“, „Лепшая рада“, „Маладая гаспадынька“.

У названых вершах аўтар высмейвае такія рысы жанчын, як наіўная хітрасць, неахайнасць, лянота, гаварлівасць.

З высмейваннем наіўнай хітрасці сутыкаемся ў вершах „Прыйшла ў цэркву раз бабулька“ і „Лепшая рада“. Высмейванне мае ў гэтых творах лагодны, бяскрыўдны характар. У вершы „Прыйшла ў цэркву раз бабулька“ выведзена старэнькая жанчына, якая ў царкве ставіць адну свечку пераможцы чорта святому Мікіту, а другую свечку чорту. Цікавыя матывы, якімі абасноўвае старая свой паступак:

— Што ты, — кажуць, — робіш баба:
то ж нячыста сіла!
Абярнуўшыся, так кажа: — Не
судзіце людзі,
З нас ніхто не знае добра, дзе па
смерці будзе:
Ці у небе, ці ў пекле скажуць
векаваці.
Мець прыяцеля трэ ўсюды, каб мог
нам спрыяці.

Несумненна, гэты апартуністычны практыцызм, імкненне прыслужыцца і вашым і нашым, мысленне аб пазагробным жыцці ў небе або ў пекле ў даным вершы сапраўды камічныя. Цяжка аднак тут гаварыць аб антыфеміністычным настроі. Старая бабка смешная, але ні ў якім выпадку не ненавісная ні пісьменніку, ні чытачу, наадварот, сваёй наіўнай хітрасцю выклікае ў нас сімпатыю.

З іншай катэгорыяй наіўнай хітрасці маем дачыненне ў вершы „Лепшая рада“. У гэтым творы паказана жанчына, якая выслухоўвае настаўніка аб тым, што яе сын хуліганіць страшэнна ў школе, не згаджаецца з настаўнікам. Калі той раіць зрабіць сыну разговую „лазню“, кабета мае на гэта свой пункт гледжання. Раіць яна, каб настаўнік збіў не яе сына Лук'яна, а нейкага іншага хлопца. Паводле жанчыны, яе Лук'ян назіраючы гэтую сцэну, напэўна зменіць свае паводзіны. Несумненна, хітра і наіўна адначасова.

— Не, панок, нашто?! Не трэба
З ім нам мардавацца.
Ён і так шмат памякчэе,
Будзе лепш старацца,
Калі пан замест Лук'яна
Ды хлопца другога
Лазой зрэзаў, дык тады б той
Прысмірэў бы многа.

У гэтым вершы так, як і ў папярэднім, не выступае сатырычнае высмейванне. Хутчэй маем тут дачыненне з дабрадушнай іроніяй, чым са зласлівым сарказмам.

Ужо было сказана, што Паўловіч высмейвае ў сваіх феміністычных творах, між іншым, неахайнасць. Гэту праблему закранае ён у вершы „Гаспадыніна дзежа“.

Што ў іншай хлеў чысцейшы, як у
Юлькі хата;
Што начынне — лыжкі, міскі ў палец
абкарэлі;
Як зямля — і стол і лаўка гэтак
учарнелі;
Страшна глянуць на бялізну, а не то
што стыдна;
Дзежка цеста так заросшы, што і дна
не відна.

Вось гэта дзежка і з'яўляецца прадметам, пры дапамозе якога аўтар дэманструе неахайніцу Юлю. Высмейванне тут аднак не вядзецца непасрэдна. Аўтар уводзіць у верш двух краўцоў, пры дапамозе якіх распраўляецца з жанчынай. Краўцы, хочучы закпіць з гаспадыні, пачынаюць спрэчку. Адзін з іх гаворыць, што дзежа зроблена з дрэва, другі, што яна злеплена з цеста. Гаспадыня, улучыўшы момант, калі адзін з краўцоў выйшаў з хаты, не заўважаючы ўсёй камедыянцкай спрэчкі, раіць аднаму з краўцоў смела закладацца і даказаць, што дзежа сапраўды драўляная, бо яна, вышаўшы замуж, памятае, што на дзежы было яшчэ добра відаць абручы, якія зараз поўнасцю абраслі цестам.

У адрозненні ад вершаў „Прыйшла ў цэркву раз бабулька“ і „Лепшая рада“, у якіх, як мы ўжо сказалі, не было ні сатырычнага высмейвання, ні антыфеміністычнага элементу, у вершы „Гаспадыніна дзежа“ выступае выразна завостраная саркастычная тэндэнцыя. І пісьменніку і чытачу цяжка глядзець з лёгкай усмешкай на Юлю, дзежка якой так зарасла цестам, што ў яе „ледзь кулак адзін пралезе“. Зразумела, што выступае тут гіпербалічная завостранасць, але яе паяўленне звязана з выразнымі адмоўнымі адносінамі пісьменніка да гераіні.

Трэба толькі даверыцца...

Не ўсё адразу. Вось пасадзілі вы яблыню. Маленькая, тоненькая і мовы пакуль што быць не можа пра яблыкі. Але прайшоў час. Кожны дзень вы праходзілі каля яе і нават не заўважылі, калі паявіліся першыя плады. Так і ў гаспадароў. Здавалася б, усё звычайна, усё так, як і трэба. Але калі селянін пералічае назад старонкі свайго жыцця, ну, прыкладна, гадоў на дзесяць, то — ого! Розніца вялікая. І большая колькасць малака, і якасць яго лепшая, і каровы іншыя. Калі калісьці, глянуўшы на лугі, убачыў ты амаль усе чырвоныя, то цяпер яны пачарнелі ды пабялелі. Што за цуд?

Адказу на гэта пытанне трэба шукаць у рэчаіснасці, а дакладней на станцыі гадоўлі і штучнага апладнення сельскагаспадарчай жывёлы. На Беласточчыне ёсць іх дзве: у Бельску і ў Парослах, што каля Беластока. Заглянем у Паросды. Станцыі, дзе пад кіраўніцтвам дырэктара Станіслава Залеўскага працуе 60 з адпаведнай падрыхтоўкай чалавек, 15 год. Сваёй дзейнасцю ахоплівае яна 32 гміны (з чаго дзве знаходзяцца ў Ломжынскім ваяводстве), размешчаныя ў былых паветах: Беластоцкім, Дуброўскім, Лапскім, Манецкім і Сакольскім, дзе згодна з падлікамі ёсць каля ста тысяч кароў, раздзеленых на 185 цэнтраў штучнага апладнення, якія абяспечаны адпаведна падрыхтаванымі інсемінатарамі. Кожны з іх абслугоўвае ад 350 да 400, а нават да 1000 кароў у год.

Заданне станцыі — паляпшаць генетычную якасць жывёлы, дзякуючы адпаведна арганізаванаму размнажэнню, для якога выкарыстоўваюць высакаякасных бугаёў. А маюць іх тут 56: 47 пароды чорна-белай нізіннай і 9 — мясной, „шаралез". Усе яны правераны па паходжанню і з пункту гледжання перадачы сваіх якасцей на патомкаў, якую мераць або вагой, або колькасцю ды якасцю малака, гэта значыць карова з такога апладнення павінна даваць ад 5 да 7 тысяч літраў малака, якое павінна мець каля 4% тлушчу. Робяць усё гэта з думкай аб сялянах. Згодна з доказамі, чорна-белая парода больш вартасная і дае большую карысць гаспадару. У сувязі з гэтым станцыя вырашыла поўнасцю выкараніць чырвоную пароду. Гэта будзе карысна і сялянам і дзяржаве. Набліжаюцца да гэтага дзвюма дарогамі. Першая — продаж гаспадарам падгадаваных цялят пароды НЦБ і другая — штучнае апладненне, зразумела, насеннем гэтай жа пароды. Як і ў першым спосабе, так і ў другім ёсць, аднак, небяспека. Гаспадар, закупіўшы такое цяля, думае, што ўжо дабрабыт так і пацячэ, і часта забываецца аб змене ўмоў гадавання. Потым наступае расчараванне, а тое, што абяцалі пры продажы, ён пачынае лічыць хлуснёю. Так і з другім спосабам. Першае пакаленне пасля апладнення чырвонай каровы насеннем чорна-белага бугая выходзіць наогул чорным. Але гэтага не трэба палохацца. Так згодна з правіламі генетыкі і быць павінна. Няма тут ніякага ашуканства.

Але вернемся зноў на станцыю гадоўлі і штучнага апладнення сельскагаспадарчай жывёлы.

— Які спосаб лепшы? — звяртаемся да галоўнага спецыяліста па справах гадоўлі і размнажэння інжынера Міхала Васілеўскага.

— Абодва добрыя. Ёсць толькі ўказанні, да якіх трэба прыстасавацца. Калі будуць палепшаны ўмовы гадоўлі, закупленыя цяляты поўнасцю дадуць тое, чаго ад іх чакаюць. Але калі хто не можа даць патрэбных умоў, хай ідзе за штучным апладненнем. Гэта ж тое самае, толькі што даўжэй.

Значыць, трэба даверыцца, і ўсё будзе добра. Бывае і так, што ў гаспадара ёсць не надта добрая карова. Цялят, аднак, хацелася б мець добрых. Хто ж гэтага не хоча? Ёсць і на гэта спосаб. Такую карову трэба тады апладніць насеннем мясной пароды „шаралез". Вялікая карысць. Цяляты родзяцца дасканалыя і надта хутка набіраюць вагу. Толькі што яны не надаюцца на гадоўлю, але калі ўлічыць тое, што за кожны кілаграм на дзяржаўным рынку плацяць гаспадару на два злотых даражэй, як за звычайнае цяля, то прыйдзем да вываду, што тут ёсць вялікая карысць.

Станцыя — гэта толькі база планаў і насення. Усё астатняе выконваюць інсемінатары. Яны размаўляюць з сялянамі, яны прапануюць ім насенне, якое станцыя давозіць два або тры разы ў тыдзень. Бывае і так, што карова не зацяжыла. Тады паўтараюць. Паўторка, зразумела, бясплатная. Але калі пасля трох раз карова не зацяліца, значыць яна хворая. Трэба яе лячыць. Лячэнне таксама бясплатнае. Часта, аднак, гаспадары махаюць на гэта рукою і ўсю віну бясплоднасці каровы звальваюць на інсемінатара. Гэта вялікая памылка несвядомасці. Так бывае. Кожны ветэрынар аб гэтым скажа. А вынікі лячэння ёсць. Прыкладам можа быць тое, што на тэрыторыі інсемінацыйнага цэнтра у Козліках Заблудаўскай гміны, якім апякуецца Мікалай Камінскі, на тры каровы, што былі накіраваны на лячэнне, усе як адна вярнуліся вылечаныя. Добрай дарогай ідзе станцыя гадоўлі і штучнага апладнення сельскагаспадарчай жывёлы. Патрэбны толькі давер з боку сялян.

Міхась Шаховіч

Партыя на вёсцы



Зямля павінна даваць больш плёнаў, гаспадары павінны лепш яе апрацоўваць, правідлова ўгнойваць, больш дбаць аб яе выкарыстанні — такія стаяць заданні перад нашай сельскай гаспадаркай. У ажыццяўленні гэтых задач галоўную ролю адыгрываюць вясковыя партыйныя арганізацыі, якія сваёй арганізатарскай дзейнасцю і прыкладам сваіх членаў спрыяюць павышэнню ўраджаяў і паляпшэнню вынікаў у жывёлагадоўлі.

Як інфармуе нас першы сакратар гміннага камітэта ПАРП у Бельску тав. Бручко, усе 43 вясковыя партыйныя арганізацыі добра выконвалі свае абавязкі і падчас жніўнай кампаніі, і падчас сяўбы азімых культур, і ў час бульбакапання.

Партыйныя арганізацыі добра спраўляюцца таксама ў сваім асяроддзі з прапагандысцкімі заданнямі, распаўсюджваючы пастановы з'езду і чарговых пленумаў ПАРП. У апошнім часе многа ўвагі ўдзялілі яны праграме, прынятай на XV пленуме ЦК ПАРП, а ў тым ліку мясцовай гміннай грамадска-гаспадарчай праграме.

Разгортваючы сваю дзейнасць, не забываюць яны і аб тым, каб найлепшых людзей прымаць у партыйныя рады. У бягучым годзе гмінная партыйная арганізацыя павялічылася на 33 новых кандыдатаў і налічвае цяпер больш як 700 таварышаў.

У нялёгкай працы партыйных арганізацый на вёсцы асабліва самаахвярна працуюць іх сакратары, якія ўгрунтоўваюць сярод сялян перакананне, што зямля, хаця яна прыватная, з'яўляецца агульнанародным дабром, і таму ступень яе выкарыстання сялянамі мае грамадскі характар. На нашым здымку сакратар ПАП у Мокрым — Язэп Лукашук.

Тэкст і фота **М. Хмялеўскага**

Ф·А·Л

Allegro

Ой ты, ба - цен

од - да - еш ме

Ой ты, баценьку-соловей
оддаеш мене молодзеньку
Оддаеш мене молодзеньк
прыкуй мне зозулю гол
коб рано ўстала й закова
мене молодую пробуджа.

Ад Вікторыі Шумарска
пісаў 12 кастрычніка 19
магнетафоннай стужкі Л

Што новага

НА ДЗЯРЖАЎНЫМ ФОНДЗЕ ЗЯМЛІ

Кааператыў сельскагаспадарчых гурткоў у Нараўцы з сядзібай у Міклашэве да канца бягучага года будзе весці 250-гектаровую гаспадарку на дзяржаўным фондзе зямлі, з ліку якіх сорак гектараў гэта зялёныя ўгоддзі. Сёлета СКР прадаў дзяржаве 92 тоны жыта, 38 тон аўса і 22 тоны ячменю. Сярэдні ўраджай трох збожжавых культур быў 23,5 цэнтнераў з аднаго гектара, вышэйшы ад сярэдняй гміннай. Сёлета кааператыў пасеяў 80 га азімага жыта „Данькоўскага залатога" і „Панцэрнага" ды вясною пасее яшчэ 80 га аўса „Леанда", 20 га ячменю „Дамазы" і 40 га жоўтага лубіну.

Сёлета СКР пачаў весці свінагадоўлю. Зараз у паспулдзельчай аборы ў Ляшуках трымае 200 свіней да поўнага адкорму. Для іх адведзена звыш 30 тон паранай бульбы і шмат неабходных мяшанак. У будучым годзе ў Ляшуках будзе ўжо 400 свіней. Таму будзе разбудавана хлеўня і пабудавана глыбінная (артэзіянская) студня.

Цяпер СКР карыстаецца 53 трактарамі, 4 камбайнамі, 22 малацільнымі агрэгатамі, камбайнам для капання бульбы і шматлікімі іншымі сельскагаспадарчымі машынамі, колькасць якіх з году ў год павялічваецца.

КУРОРТНЫЯ АБ'ЕКТЫ

Коштам звыш трох мільёнаў злотых будуюцца курортныя аб'екты ў Нараўцы над ракой пад такой самай назвай. Тут жа ў будынках будуць перахоўвацца байдаркі і ўсялякія купальныя прылады і прыборы. Новыя аб'екты будуць гатовы на будучае лета.

БУДЗЕ АСФАЛЬТАВАНАЯ ДАРОГА

У гміне Нараўка за апошнія гады асфальтаваныя дарогі былі пабудаваны з Нараўкі ў Міклашэва і з Новага Ляўкова ў Падляўкоўе. Найважнейшая, аднак, дарога праз Белавежскую пушчу — з гміннай вёскі Нараўкі ў Навасады — у далейшым не мае асфальту. Гмінныя ўлады ўзяліся і за вырашэнне гэтай справы. Пабудова асфальтаванай дарогі ў напрамку бліжэйшага горада Гайнаўкі пачнецца ў 1978 годзе.

УЗНАГАРОДЫ ДЛЯ НАСТАЎНІКАЎ

З нагоды Дня настаўніка дзве ляўкоўскія настаўніцы: Валянціна Самойлік і Ірэна Пташынская былі ўзнагароджаны Залатымі Крыжамі Заслугі. Узнагароду Міністра асветы і выхавання другой ступені атрымала трэцяя ляўкоўская настаўніца Надзея Пяткевіч.

Варта дадаць, што ў мінулым годзе з такой жа нагоды былі ўзнагароджаны Залатымі Крыжамі Заслугі настаўнікі: Надзея Пяткевіч, Васіль Цялушэцкі і Мікалай Барташук — усе таксама са Старога Ляўкова.

ТОЛЬКІ Ў ЛЯЎКОВЕ 1800

На пункце скупкі малака ў Новым Ляўкове штодзень збіраецца 1800 літраў малака, а ў месяц 47-52 тысячы літраў. На гайнаўскае малачарскае прадпрыемства возяць яго ляўкоўскія трактарысты. Зборшчыкам шмат гадоў працуе тут Васіль Грыгарук. Найбольш малака дастаўляюць на пункт скупкі сяляне: Міхась Баканач, Сяргей Цялушэцкі, Васіль Грыгарук, Мікалай Болбат, Васіль Леўчук, Канстанцін Семаковіч (гадуюць яны па 6-8 дойных кароў) — усе з Новага Ляўкова ды Уладзімір Прычыніч і Аляксандр Бірыцкі са Старога Ляўкова.

СТВОРАНЫ СПАРТЫЎНЫ КЛУБ

У Нараўцы стварылі спартыўны клуб пад назвай „Лес". Узначаліў яго Павел Леўша, начальнік чыгуначнай станцыі ў Семяноўцы. Кіраўніком клуба з'яўляецца Барыс Савіцкі, работнік надлясніцтва Броўск. Клуб мае сваю сядзібу ў мураваным будынку побач спартыўнага стадыёна. Неўзабаве да яго будзе падключаны электрычны ток і вада.

Ужо пачалі актыўную дзейнасць дзве спартыўныя секцыі: 30-асабовая футбольная пад кіраўніцтвам мясцовага настаўніка Яўгенія Янушкевіча і сяміасабовая настольнага тэніса.

АДНАЎЛЕННЕ БУЛЬБЫ

У кастрычніку гэтага года сяляне вёсак Ляўкова, Капітаншчыны, Тарнопаля, Сушчага Барка, Крыніцы, Ахрымаў, Падляўкова, Бернацкага Мосту і іншых купілі на аднаўленне звыш сарака тон бульбы сартоў: „Гевонт", „Уран", „Леніна". Усю з насеннай цэнтралі ў Бельску ў класе А.

ПОМНІК САВЕЦКІМ ВОІНАМ

9 мая 1977 года з нагоды Дня Перамогі над фашысцкімі захопнікамі ў Нараўцы будзе адкрыты помнік савецкім воінам, якія загінулі ў вайну, вызваляючы тутэйшую зямлю. Вялікую фінансавую дапамогу ў пабудову помніка ўнесла мясцовае насельніцтва.

Янка Цялушэцкі

Кажуць, што...

Такой цеснаты, як у Гайнаўскім белліцэі, няма, бадай, у ніводнай сярэдняй школе. Калі было цёпла, педагагічны савет наладжваў свае пасяджэнні на школьным панадворку.

Што, аднак, будзе зімой?

Таму такі заклапатаны і сядзіць дырэктар ліцэя.

Тэкст і фота **В. Р.**

...ток практычных ведаў



...ІНЕЗОН ДЛЯ 3—5-ГАДОВАГА ДЗІЦЯЦІ


...акі камбінезон трэба ўзяць 1,80 м ...ялу шырынёю 0,90 м, ці 0,95 м ...ялу шырынёю 1,40 м. Можна ...зеля гэтага вельвет, эланабавоў-... нейкі эластычны матэрыял.

...незон гэты мае даволі вялікае ...э і шырокія пахі. Спераду ён ...ецца на замок. Калошы ўнізе ...расшыраныя. Спераду камбіне-... облены дзвюма кішэнямі і ка-... аплікацыяй.

...йку трэба нарысаваць у нату-... велічыні і зверыць яе з паме-...іцяці. Калі будзеце кроіць, не ...ецся дадаць матэрыялу на швы ...энне. Скроеныя часткі сфастры-... памерыць камбінезон. Праве-...лькі трэба выразаць каля шыі, ... дапасаваць даўжыню камбіне-зона. Камбінезон павінен быць свабодны, каб дзіця сябе ў ім добра адчувала.

Зрабіўшы ўсе неабходныя папраўкі, сшыць спачатку знешнія і ўнутраныя швы калош, а пасля гэтага плечы і шоў на спіне да месца заканчэння замка спераду. Швы разгладзіць. Дэкальтэ і пахі закончыць з левага боку паводле выкрайкі. Пасярэдзіне пераду ўшыць замок. Падшыць ніз камбінезона. Зрабіць стэбноўку на кішэнях, дэкальтэ і пахах. Нашыць аплікацыю. Старанна выпрасаваць увесь камбінезон.

Гаспадыня





...ведаеце, што...

...ольшчы сярод кожных 100 ін-...льных гаспадароў ёсць 42 жан-... ...шай краіне гурткі вясковых гаспадынь (КГВ) вядуць больш 2.200 мастацкіх калектываў. (ця)

Кансультацыя юрыста

ПЫТАННЕ: Ужо шэсць год малодшы сын утрымоўвае і даглядае матку, якая мае I групу інваліднасці. Старэйшы сын не дапамагае ўтрымліваць матку, спасылаючыся на тое, што малодшы сын атрымаў гаспадарку. Гаспадарка складаецца з 4 га зямлі V і VI класа. Старэйшы сын пражывае ў горадзе і зарабляе каля 5000 зл. у месяц. Яго матэрыяльнае палажэнне з'яўляецца значна лепшым, чым малодшага брата. Ці малодшы яго брат можа патрабаваць ад яго, каб памагаў утрымоўваць матку, а калі так, то ці толькі ў будучыні, ці і за час прошлы нешта належыцца?

АДКАЗ: Абавязак утрымоўваць матку спачывае на ўсіх яе дзецях адпаведна да іх матэрыяльнага палажэння. Не мае пры гэтым значэння тое, што сельская гаспадарка прыпала малодшаму сыну, а старэйшы сын пражывае ў горадзе і з гаспадаркі не карыстаецца. Прысуджэння аліментаў можа патрабаваць толькі матка. Можа яна падпісаць паўнамоцтва малодшаму сыну, каб выступаў у яе справе. Аднасна прошлага часу, калі матку ўтрымоўваў поўнасцю малодшы сын, можа ён патрабаваць ад свайго брата, каб звярнуў яму адпаведную да іх маёмаснага палажэння частку расходаў. Нельга патрабаваць звароту гэткіх расходаў за час даўжэйшы, чым тры гады.

Сардэчныя тайны


Дарагое Сэрцайка! На апошніх канікулах пазнаёмілася я з Юркам. Юрка прыстойны бландзін, спадабаўся мне з першага погляду. А ўбачыла я яго першы раз у гасцях у майго брата. Было якраз свята, і ў нашай вёсцы была забава. Я цэлы вечар гуляла з Юркам. На другі дзень ён паехаў. Напісаў мне адно пісьмо, я адпісала, але больш ад яго не атрымала. Мы вучымся ў тым самым горадзе і, калі пачаўся школьны год, мы ўжо многа разоў спаткаліся. Гаворым на агульныя тэмы, але ніколі не гаварылі аб нашым каханні. Я заўважыла, што Юрка чуе штосьці да мяне, але не адважыцца сказаць. А я ўжо не магу далей у такой няпэўнасці жыць. Я яго кахаю і не бачу света без яго.

Ірэна з Беласточчыны

Ірэна! Чаго ж ты так непакоішся? Не так даўно вы сябруеце. Не кожны хлопец так адразу прызнаецца ў каханні. Найчасцей маладым цяжка адважыцца і выліць словамі перад каханай тое, што ў сэрцы накапілася. Будзь спакойна, усё прыйдзе з часам.

Сэрцайка

Этнаграфічнае акенца



Мастацкая абліцоўка вугла і падстрэшша хаты ў вёсцы Баб'я Гара гм. Нараўка. Дом збудаваны ў пяцідзесятых гадах нашага стагоддзя.

Фота М. Гайдука.

Вер-не вер

Сніцца мне так. Быццам вярнулася я з працы і ўспомніла, што мой муж пайшоў да знаёмых. Я, доўга не думаючы, таксама пайшла туды. Увайшла ў хату, а яны ўсе пры стале сядзяць і гасцююць. У пэўным моманце чую, што муж сяброўкі з зяцем пачынаюць спяваць. Хацела я ім памагчы, але ўстрымалася і папрасіла, каб мне паказалі іхняе малое дзіця. Яны мне паказалі яго. Дзіцё было вельмі прыгожае, прыгожа апранутае і мела вялікія, блакітныя вочкі і беленькія, не вельмі доўгія валасы. Тады я папрасіла, каб далі мне яго патрымаць. Але маці таго дзіцяці баялася, каб я не ўпусціла яго, але дала. Я вельмі цешылася ім. Ну і ўжо збіраюся з мужам ісці дахаты. Сяброўка мяне праводзіць, і раптам я бачу, што ў яе вялікая кухня. А на гэтай кухні балаган, брудна. І я думаю, што сяброўка сароміцца і не запальвае святла. Мой муж хацеў сяброўцы заплаціць за паўлітра гарэлкі сто злотых. Сяброўка іх узяла, але мужу выдала 50 зл. рэшты. Усе грошы былі папяровыя. У гэты момант, калі сяброўка давала рэшту, з пакоя выйшаў п'яны сваяк знаёмых і накіраваўся ў гэтую кухню. Але сяброўка яго адтуль выпхнула. Мы развіталіся і пайшлі дамоў.

Галіна

Сон ваш нядрэнны, хаця яшчэ лепш было б, каб вы заспявалі разам з мужам сяброўкі і зяцем. Добра прадвяшчае тое дзіця, якое вы ўзялі на рукі — было ж яно прыгожае і мілае. Вас або вашую сяброўку чакае перамена дома, кватэры ці працы (на кухні сяброўкі быў балаган). Вы бачылі ў сне п'янага — маеце нейкага дурнога сябра. Можа ў сувязі з гэтым вынікнуць клапатлівыя справы, дарэмны труд і нейкі смутак (папяровыя грошы)...

Астрон



ІЛЬЯ РАЖКОЎ

ЧАЛАВЕК З ЛЕГЕНДЫ

Мінуў тыдзень, другі, і Арлоўскі даведаўся, што Шатырку перавялі начальнікам паліцыі на другі ўчастак, але ад самога яго не было ніякіх паведамленняў. Тады Кірыла Пракопавіч вырашыў паслаць да Шатыркі свайго чалавека. Пайшоў Аляксандр Федаровіч.

— Пойдзеш у Мядзведзічы. Скажаш, што, маўляў, партызаны прайшлі ноччу праз вёску Куляні, — вучыў камандзір свайго разведчыка. — Паглядзіш, як ён будзе рэагаваць на тваё паведамленне. Толькі, калі пераканаешся, што Шатырка верны свайму абяцанню, назавеш пароль.

Так і зрабіў Аляксандр. Выслухаўшы яго, Шатырка закідаў яго пытаннямі: калі прайшлі, колькі іх было, хто іх канкрэтна бачыў, куды яны накіроўваліся, як узброены?

— Я сам партызан не бачыў, але ў вёсцы кажуць, што ноччу яны як быццам былі, — трымаўся за сваё Федаровіч.

— Табе што — палак захацелася, што ты з плёткамі ў паліцыю лезеш? — заззлаваў Шатырка. — „Сам не бачыў", „як быццам", „кажуць"... Рабіць табе няма чаго, гультай! Вось загадаю ўсыпаць добра, тады дзесятаму закажаш, як паліцыю ашукваць.

І чым болей лаяў паліцэйскі начальнік Федаровіча, тым лягчэй рабілася ў таго на душы. „Не выдасць", — вырашыў ён.

— Сёння добрае надвор'е, а пан начальнік псуе настрой сабе і іншым, — сказаў Федаровіч, калі Шатырка на хвіліну замоўк.

Шатырка ўздрыгнуў і дапытліва ўтаропіўся на Федаровіча.

— Мм... Так, надвор'е спрыяльнае, — адазваўся ён на пароль і, пазіраючы на дзверы, растлумачыў партызанскаму разведчыку, чаму не змог перадаць матэрыялы ў прызначаны час: прымаў новы ўчастак, давялося некалькі разоў з'ездзіць у Баранавічы. Праз два дні ён зможа сустрэцца з Раманам ці Мішам.

Не адзін раз пасля таго сустракаўся Арлоўскі з Шатыркам. І заўсёды Шатырка даваў праўдзівыя, падрабязныя і каштоўныя звесткі пра варожыя гарнізоны ў Баранавічах, Ганцавічах, Ляхавічах. Канчаткова пераканаўшыся, што Шатырка — свой чалавек, камандзір „Сокалаў" перадаў у Цэнтр: „Намі прыцягнуты да работы начальнік мясцовай паліцыі. Паведамляе праўдзівыя звесткі".

А праверыць праўдзівасць звестак Шатыркі камандзіру „Сокалаў" было не надта і цяжка: разведчыкі яго атрада дзейнічалі і ў Баранавічах, і ў Ляхавічах, і ў Ганцавічах, прабіраліся ў Мінск і Брэст. Асабліва шмат разведчыкаў „Сокалаў" было ў Баранавічах: у горадзе пастаянна знаходзіліся буйныя сілы праціўніка, размяшчаліся склады харчавання, боепрыпасаў. Важнае месца гітлераўцы адводзілі Баранавічам і як вузлавой чыгуначнай станцыі, праз якую ажыццяўляліся асноўныя перавозкі для групы армій „Цэнтр".

Амаль ва ўсіх навакольных вёсках, у многіх гарадах і мястэчках меў атрад сваіх разведчыкаў і сувязных. Днём і ноччу, рызыкуючы сваім жыццём і жыццём родных і блізкіх, дапамагалі яны лясным байцам. Дастаткова было якому-небудзь здрадніку толькі намякнуць нямецкім уладам пра сувязь патрыётаў з партызанамі, як патрыётаў чакалі страшэнныя пакуты і смерць.

Праўда, здраднікаў было не так многа, але і яны былі вельмі небяспечныя. І таму з першых жа дзён знаходжання ў тыле камандзір „Сокалаў" дару-чыў сваім разведчыкам выяўляць, выкрываць здраднікаў. З тымі, хто прадаў свае чорныя душы акупантам, партызаны размаўлялі суровай і строгай мовай ваеннага часу — мовай зброі.

• • •

Часта, ледзь не кожны дзень, прыходзіў у атрад Васіль Халецкі, сустракаўся з Кірылам Пракопавічам.

Камандзір „Сокалаў" добра ведаў па далёкай Іспаніі вераломства гестапаўскіх і абвераўскіх агентаў, а Васіль Халецкі з разведвальнай і контрразведвальнай работай сутыкнуўся зусім нядаўна. Выручалі лесніка вялікі жыццёвы вопыт, прыродны розум і назіральнасць. Ды і на настаўніка яму пашанцавала.

— Кажуць, шавец нядаўна аб'явіўся ў Лапацічах. Збіраюся як-небудзь занесці абутак у рамонт, — гаварыў аднойчы Халецкі Арлоўскаму. І тут ажывіўся: — Бат камандзір, здэцца, паповіч не выпадкова зачасціў у Галынку.

— Гэта што яшчэ за паповіч? — зацікавіўся Арлоўскі.

Халецкі расказаў, што да мясцовага бацюшкі Халюсціна часта на дзень-два прыязджае з Баранавіч яго сын Уладзімір. Служыць ён там ці то бухгалтарам, ці то рахункаводам. Хлопец як хлопец, на гітары добра грае, франт, духі любіць. Праўда, цікавіўся, ці ёсць у лесе дзікі.

Арлоўскі папрасіў Халецкага больш уважліва прыгледзецца да шаўца і па-

ТРЫБУНА чытачоў

Моладзь спявала ў Гродна

У сувязі з Днямі польскай літаратуры на Беларусі моладзь групы сельскагаспадарчых школ у Бельску, якая складае мастацкі гурток, у кастрычніку пабывала на Гродзеншчыне. Наш калектыў выступіў з падляшскімі танцамі і песнямі ў Гродна, Лідзе і Навагрудку. Канцэрты падабаліся гледачам. А моладзь пазнаёмілася з жыццём і гарадамі Беларусі.

Мікалай Няплоха



МАЦІ І СЫНОК

З напышлівасцю барона,
З позіркам Напалеона,
З галавы, як леў, кудлаты,
З места прэ да роднай хаты
У вёску, да радзімай хаты,
Чыюсь спажыцца, штось ўбаравайцы.
Маці сына спатыкала,
Частавала да адвала,
З шчырай маціярынскай ласкі
Пхала ў торбу сыр, каўбаскі,
Кумпяка, вянліну, сала —
Торба аж па швах трашчала.
— На, сыночку, спажывай,
І мяне не забывай!
— О-кей, маці, не забуду,
Як з'ем гэта, зноў прыбуду.
Ты таксама не забудзь
Якась мне грашэй здабудзь,
Бо ў дагі халерны ўлез,
Грошай трэба назарэз,
Без грашэй няма жыцця —
Я ж, аднак, тваё дзіця!
(Ну й дзіця, ядрона маць, —
Год не менш, як дваццаць пяць).
Не сказаўшы й слова потым,
Дзьмухнуў з сумкай з паваротам,
А старэнька маці ў хаце
Стала думаць, што прадаці.
Бо як вяпрука прадаць —
Што сыночку ў торбу даць?
Альбо — як кароўку збыць,
З чаго сыр тады зрабіць?
А без сыра ды каўбаскі
Ці ж здабудзеш ў сына ласкі?
І ў канцы рашыла так:
Прадам семя, грыбы, мак,
Зелле — лекі, што ўзбірала,
Палатно, што летась ткала,
Труса, курыцы прадам,
Усе грошы сыночку дам.
Хай саколік мой, Іван,
Ў горадзе жыве, як пан.
Так рашыла добра маці.
Мацерам не дзівавацi.
Клопатаў усё не брак, аднак
Ад такіх сыночкаў вас
Барані Бог!

Дзядзька Квас

повіча, а заадно — і да самога бацюшкі.

Рамантаваць боты Халецкаму не давялося. Матруна Фадзеўна, у якой спыніўся шавец, сказала лесніку, што яе пастаялец забраў свой заробак і паехаў дамоў, некуды за Нясвіж.

Затое паповіч пачаў набівацца ледзь не ў сябры да лесніка.

Падазронымі здаліся паводзіны Уладзіміра Халюсціна і братам Аляксандру і Паўлу Пінчукам. Паповіч, які ніколі не трымаў у руках паляўнічай стрэльбы, раптам пачаў распытваць леснікоў пра дзікоў. А заадно, нібыта між іншым, зацікавіўся і партызанамі — ці не бачылі іх леснікі ў лесе.

Нечаканы клопат пра дзікоў у тыя дні пачаў праяўляць і ляснічы Сяргей Бабко.

— Каб прыкладзіць у наш лес больш дзікоў, трэба завезці туды вотруб'я, бульбы, падкармліваць іх, — загадаў ён леснікам.

Доўга ламалі галаву Кірыла Арлоўскі і Рыгор Івашкевіч, чаму Бабко і Халюсцін раптам зацікавіліся дзікамі і партызанамі. Хто іх больш цікавіць — партызаны ці дзікі? Не ўсё было вядома і пра паповіча. І толькі пасля таго, як баранавіцкія разведчыкі паведамілі сваіму камандзіру, што паповіч — агент СД і што працуе ён у галоўнага камісара Баранавіч групенфюрэра Фрыдрыха Фенса, заядлага паляўнічага, Арлоўскі змог адказаць на гэтыя пытанні.

(Працяг будзе).

Каб супольна

Аб клубе, які ёсць пры спулдзельні інвалідаў „Постэмп“ у Гайнаўцы, ведаюць многія. Тут чыста, парадак, прыгожая мэбля, тэлевізар, бібліятэка. Прыходзяць сюды не толькі працаўнікі спулдзельні, прыходзяць таксама жыхары горада. Як сцвярджаюць жыхары гэтага раёна, было б пажаданым, каб гайнаўскі ВСС наладзіў супрацоўніцтва з клубам. Прыгадзіўся б тут пункт „Практычнай пані“, ды іншыя цікавыя формы працы. Ёсць прапанова, каб ВСС звярнуўся да сваіх членаў і дзеячоў з заклікам уключыцца ў супольную працу ў клубе.

Крыніца

Паслы ў Бельску

У кастрычніку групу сельскагаспадарчых школ у Бельску наведала сеймовая камісія адукацыі і выхавання. Паслы-настаўнікі пазнаёміліся са школай, працай настаўнікаў, школьнымі арганізацыямі, з абсталяваннем школьных кабінетаў. Абмеркавалі дзейнасць сельскагаспадарчых школ на Беластоцкай зямлі і прынялі пастановы аб іх далейшай працы. Гэта вельмі важная праблема ў сувязі з тым, што ўжо хутка будуць працаваць рэфармаваныя дзесяцігадовыя школы.

Мікалай Няплоха

Каб такіх сыноў...

Пасёлак Нарва ляжыць над рэчкай Нарвай. На вуліцы Бельскай стаіць тут дом, прыгожа памаляваны. У сярэдзіне пакойчыкі двух-, і трохасабовыя, мяккія ложкі, белая пасцель, чыстыя гардзіны, дываны, кветкі, столікі. Адным словам, чысціня. Ёсць прыгожая святліца з тэлевізарам і радыё, цёплая вада, ванны.

Улады гміны прызначылі гэты будынак на дзяржаўны дом для пенсіянераў. Як інфармуе кіраўнік яго, Аляксандра Свенцкая, тут старыя людзі маюць усебаковую апеку. Кормяць іх добра, смачна, тры разы ў дзень, на месцы лекар. Дапамагае кіраўніку Ніна Пляскович — вопытны працаўнік.

✲

Чацвер, 7.X.1976 года. Машына „Ныса“ пад'ехала да старэнькай хаты ў прыгожай вёсцы Чыжы, каб забраць і завезці старэнькую, спрацаваную, зніштчаную цяжкім жыццём Карнілюк Альжбету, дачку Данілы, у Нарву, у той дом для пенсіянераў. Забрала бабуля свае вузельчыкі, сундучок, недаедзены кавалак сухога хлеба. Развіталася з суседзямі, якія прыйшлі праводзіць яе, з працаўнікамі гміны, якія дапамаглі аформіць паперы.

Бабуля Альжбета Карнілюк жыла ў вельмі цяжкіх умовах. Вельмі часта акрамя халоднай вады не мела нічога ў роце, не гаворачы аб бярлозе, у якой даводзілася спаць старой.

Ад'ехала бабуля, пакідаючы Чыжы сына з прыгожай мураванай хатай, які нават не падышоў развітацца з сваёй роднай маці, і сыновую, як прысак.

Адпаведныя органы прысудзілі сыну плаціць за апеку над яго маці.

Крапіва

Бібліятэкі запрашаюць

Важную ролю ў адукацыі нашага насельніцтва адыгрывае кніжка. У гміне Нараўка з чытаннем кніжак па-рознаму бывае. Адны кніжкі чытаюць больш, іншыя — менш.

Ёсць тут гмінная бібліятэка, якую вядзе Зыта Савіцкая. Бібліятэка мае шмат розных форм працы з чытачом. Кожная з іх заклікае яго да кніжкі. Тут бываюць цікавыя выстаўкі, латарэі, сустрэчы з пісьменнікамі, вечары паэзіі і г.д. Каб чытачу было бліжэй да кніжкі, ёсць два філіялы ў Старым Ляўкове і Семяноўцы. Існуе дваццаць бібліятэчных пунктаў па меншых вёсках.

У гміне налічваецца 1605 чытачоў, якія пазычылі ў гэтым годзе 17.424 кніжкі. У тым ліку было прачытана 539 кніжак грамадска-палітычных, 1875 кніжак навукова-папулярных і 595 кніжак па сельскай гаспадарцы. Чытачы цікавяцца таксама літаратурай на рускай і беларускай мовах. Усяго ў бібліятэцы налічваецца 14919 кніжак. Варта зацікавіцца бліжэй бібліятэкай, калі надыходзяць доўгія асеннія і зімовыя вечары. Ёсць з чаго выбраць. Бібліятэкі запрашаюць.

Аляксандр Закройшчык

Па завулках Нараўкі

Вось не так даўно давялося мне пабываць у вёсцы Нараўка. Мо абраза гэта для мястэчка, мо лепш сказаць: у сядзібе гмінных улад. Было гэта ў аўторак — дзень торговы. Людзей поўна — з гміны і іншых мясцін. Кожны мае розныя справы. Тут прадаюць жывёліну, шкуры, макулатуру, злом і г.д. Мне давялося прайсці за людзьмі, якія ў гэты дзень атрымоўваюць грошы за свае тавары.

І вось ад прыпынку аўтобуса ПКС (ужо гадзіна дзесятая) шумна. Адны запрашаюць у „Чар пушчы“ — мясцовы рэстаран, іншыя паклікваюць сустрэцца ў іншым месцы. Мінаю гэты „Чар пушчы“, дзе вялікі гоман, нясуцца розныя нецікавыя словы, але і нашы беларускія песні. Іду далей вуліцай Міцкевіча ў напрамку банку. Думаю — што там? Там плацяць грошы і спажывецкая крама побач. Найгорш, што амаль не праваліўся, зачапіўшыся за пліткі на ходнік, якія ўжо адну зіму „пераджылі“, абапертыя на платы. Ці другую вытрымаюць?

Але што далей? Іду вось ля крамы нумар 17. Высоўваецца група людзей (запоўнены кішэні і ў некаторых тэчкі). Думаю, што яны будуць рабіць? Ідуць за краму, і тут пачынаецца бяда. Гэтыя кішэні і тэчкі — то ўсё бутэлькі з віном. Вядома, сустрэліся кум з кумам, сват з сватам і г.д., а так тут прынята, што трэба з'есці і выпіць. У гаспадзе дарага, у краме танней.

Прыемная пара года — восень, восень залатая. Але дзе прысесці? Побач млын, але гэта на адну асобу больш, ды і невядома, ці пазволіць... На пляцоўцы ГС нельга, бо тут гуляюць гусі, качкі, куры, каровы і коні. Дагэтуль ніхто не пастараўся замкнуць агароджай уваход на гээсаўскую пляцоўку між крамай і млыном. Мо такія кліенты і схаваліся б, аднак плантацыя асоту была вельмі калючая і якраз ён перацвітаў. Даволі перашкаджалі жыхары, якія жывуць побач і вывозяць тудою ўсе адпадкі да ракі. Чысціня ракі Нараўка папсавалася, і аб гаспадарах гэта не найлепш сведчыць. А мо ГС забыўся, што яны тут гаспадары? А мо хочуць выручаць каго? Мне здаецца, што маючы ўласных майстроў, можна забяспечыць сваю пляцоўку.

Асот

Дзе прадаць бутэлькі?

У Кузаве ёсць новая крама з прасторным складам. Тут людзі могуць купіць многія тавары. Забеспячэнне нядрэннае. Аднак ёсць праблема, якую я ўжо кранаў даўно (у жніўні 1974 года), і дагэтуль кляшчэлеўскі ГС не вырашыў яе.

У Кузаве прадаўшчыца не купляе бутэлек. Чаму? Толькі яна гэта ведае і прэзасы кляшчэлеўскага ГС-у. Не ведаю, ці на тэрыторыі ўсяго ГС ёсць хоць адзін пункт скупкі бутэлек. Быў калісьці ў Чаромсе, аднак там заўсёды не хапала грошай. Цяпер, як і даўней, многія возяць бутэлькі ў адлеглы Бельск, там заўсёды ёсць скупка. А іншыя завальваюць імі кожны куток у хаце. Няўжо дзяржаўныя законы не датычаць кляшчэлеўскіх гандлёўцаў?

А мо аднак ВЗГС у Беластоку падказа жыхарам Кузавы і ваколіц Чаромхі, дзе могуць прадаць парожнія бутэлькі, бо вазіць іх за 31 км у Бельск не кожны можа.

У. С.



Аўген Аніська, Аўгустова. Вашы прэтэнзіі беспадстаўныя.

Данута Сакалоўская, Гайнаўка. Фота Анны Янтар нядаўна мы змяшчалі.

Уладзімір Гайдук, Тарнопаль. Дарма лаецеся. Ніхто вам месца ў паэзіі не шкадуе. Што падыходзіць да друку — друкуем.

Уладзімір Назарка, Ціванюкі. Верш „Успаміны“ надрукуем у „Парнасіку“.

Вітальд Анджэеўскі, Гайнаўка. Першая знаёмасць добрая. Запрашаем да пастаяннага супрацоўніцтва.

Яцэк Л. Абавязкова трэба падаць поўнае прозвішча і адрас. Асабліва, што напісалі вы вельмі крытычна пра сваю вёску. Ананімная крытыка не дае ніякай карысці

Даволі самаволі!

Гмінная спулдзельня сельскагаспадарчых гурткоў у Шудзялаве з сядзібай у Паўночным Востраве мае аж тры філіялы: у Піражках, Слойцы і Бабіках. Кіраўніком філіяла СКР у Слойцы з'яўляецца Мікалай Тамулевіч, які вельмі добра ўладжвае справы сваіх кліентаў. Стараецца ён, каб кожны гектар зямлі быў заараны, абсеяны, зжаты і скошаны. Але паяўляюцца некаторыя трактарысты, якія самаволяць. Кіраўнік пашле такога касіць аднаму, а ён косіць, каму хоча.

Меў і я такі выпадак. На маё балота — сенажаць на Супраслі (27 км ад дому) запісаў я касьбу сена ўвосень. Кіраўнік прыняў маю заяўку і вызначыў трактарыста. Быў гэта Вінцук Чаховіч. Але ў трактарыста таго было многа работы, і мне ён не скасіў.

На другі дзень кіраўнік высылае іншага трактарыста — Яна Юхніка і піша мяне ў першую чаргу, а Юхніку кажа, каб ён найперш скасіў таму, каму ўчора не скасілі, гэта значыць мне і яшчэ аднаму гаспадару. Калі трактарыст заехаў на сенажаць, пачаў касіць зусім іншаму. Я спытаў, чаму мне не косіць, дык ён адказаў, што будзе касіць па парадку. Нават скасіў двум, якія ўвогуле не заказвалі. Калі прыйшла мая чарга, Юхнік паехаў касіць за два кіламетры і мяне пакінуў. Я пачаў тлумачыць, што маю першынства. На гэта ён брыдка мне адказаў, дадаўшы: „Каму хачу, таму кашу“.

У. Х.

Бульба

Як штогод, так і цяпер, у Дубічах Царкоўных ідзе скупка бульбы ў філіяле ГС. Сялянам гэта аплачваецца, бо 100 кг бульбы каштуе 208 зл. А тут яна ўрадзіла на славу. Ёсць такія гаспадары, якія прадаюць і па 20 тон бульбы.

М. Панфілюк

У АДКАЗ НА НАШУ КРЫТЫКУ

Да публікацыі: „БАЛАГАН КАЛЯ КРАМЫ“, „Ніва“ № 30 (1065) ад 25.VII.76.

Адказвае:

WOJEWÓDZKA SPÓŁDZIELNIA MLECZARSKA W BIAŁYMSTOKU.

W związku z ukazaniem się notatki na łamach Tygodnika Białoruskiego „Niwa” p.t. „Bałagan w sklepie”, Kierownictwo Zakładu Mleczarskiego w Hajnówce wyjaśnia:

Ustawiono obok sklepu kosz na odpady i zobowiązano kierowniczkę sklepu do należytego utrzymania porządku.

Stół na tarasie zostanie naprawiony. Kwiaty na wiosnę były zasadzone, lecz z upływem czasu uległy zniszczeniu, a po drugie Zakład Zieleni Miejskiej z powodu braku zdolności przerobowej nie przyjął naszego zlecenia na konserwację. Jednocześnie nadmieniamy, że na wiosnę zlecimy dla Zakładu Zieleni konserwację i pielęgnację zieleni wokół sklepu.

Dyrektor Zakładu
inż. A. Pryzowicz

Да публікацыі: „КУЛЬТУРНАЕ БЕСКУЛЬТУР'Е Ў КЛУБЕ“, „Ніва“ № 36 (1071) ад 5.IX.76.

Адказвае:

ROBOTNICZA SPÓŁDZIELNIA WYDAWNICZA „PRASA—KSIĄŻKA—RUCH” PRZEDSIĘBIORSTWO WYDAWNICZO-KOLPORTAŻOWE ODDZIAŁ W SOKÓŁCE.

W dniu 16 b.m. przeprowadzono na miejscu rozpoznanie w zakresie treści notatki prasowej, jak również rozmowę w przedmiotowej sprawie z gospodarzami tamtejszego klubu „Ruch” oraz innymi osobami (bywalcami klubu). Picie napojów alkoholowych w klubie przez gospodarza klubu nie zostało potwierdzone przez zapytane osoby. Prawdą natomiast jest, że w roku ubiegłym, kiedy klub chwilowo nie posiadał opału (kompetencja Urzędu Gminy) zarówno gospodarz klubu, jak również jego uczestnicy (bywały przypadki) nie zdejmowali okryć z głowy.

Pomimo, iż nasze wyjaśnienia i motywy stwierdzonego stanu rzeczy nie są zapewne w całości obiektywne, niemniej jednak ostrzeżono gospodarza klubu na przyszłość przed ewentualnym spożywaniem alkoholu w godzinach pracy jak również zobowiązano do zwrócenia większej uwagi na własne zachowanie i zachowanie innych w klubie zgodnie z podstawowymi zasadami i normami kultury.

Dyrektor
Romuald Mura

„Niwa” — Tygodnik RSW „Prasa—Książka—Ruch”. Skr. poczt. 149. 15-950 Białystok. TELEFON 2-32-41. Wydawca Przedsiębiorstwo Wydawniczo-Kolportażowe RSW w Białymstoku. PRENUMERATA: Oddziały „Ruchu”, urzędy pocztowe i listonosze. Indeks 36911/36671.

РАХУНАК

Я сядзеў побач з ёй на лаўцы ў парку. Яна была прыгожая, маладая, загарэлая.

— Ці не хочаце вы пайсці са мной у кафэ? — запытала яна.

Я папрасіў дазволу падумаць хвілінку. Выцягнуў запісную кніжку, аўтаручку і пачаў падлічваць:

кава і піражнае — 6 зл. 50 гр,
кветкі — 30 зл.,
рэстаран — 80 зл.,
прагулка па рацэ — 20 зл.,
начному вартаўніку за тое, што 15 разоў адчыніць дзверы — 75 зл.,
пярсцёнак — 750 зл.,
адпачынак ля мора — 8000 зл.,
заручальныя пярсцёнкі — 1800 зл.
вяселле — 6000 зл.,
каструлі — 1200 зл.,
пялёнкі — 450 зл.,
калыска — 300 зл.,
дзіцячая калыска — 600 зл.,
цацкі-лялькі — 3600 зл.,
школьны ранец, сшыткі — 250 зл.,
дзіцячы ложак — 300 зл.,
дзіцячы пасаг — 5500 зл.,
другі дзіцячы ложак — 300 зл.,
лякарствы — 2000 зл.,
нянька — 45000 зл.,
паліто, абутак — 7000 зл.,
санаторый для нервовахворых — 3000 зл.

Няма сумнення, што ў спісе былі вялікія прабелы. Адразу было відаць, што я не педант і шмат чаго не прадбачыў. Дзе, напрыклад, падарункі цешчы? А штогадовыя падарункі ў гадавіну вяселля? Дзе расходы на скасаванне шлюбу? Дзе аліменты?..


Я нават і не спрабаваў падлічыць агульнай сумы. Пакланіўся як мага больш ветліва прыгожай, загарэлай дзяўчыне і сказаў:

— Прабачце, але я заняты.

У. Гузік

НІЎКА

ПЕРАД ВЫЙСЦЕМ НА РАБОТУ



— *А ўласную думку ты не забыў?*

ПЕСНІ ПА ЗАЯЎКАХ

Па просьбе Крыстыны Шульц з Сямяціч, Ірэны Троц з Рудут, Яна Врублеўскага з Бельска, Галены Яканюк і Галіны Юзвюк з Барысаўкі, Валі Буры, Бажэны Раманюк і Алі Пташынскай з Гайнаўкі, а таксама дзяўчат з Парцава змяшчаем песню

HEJ, BARBARA

Z repertuaru Krzysztofa Krawczyka
słowa: Marek Głogowski
muzyka: K. Krawczyk, R. Poznakowski

Zalet ma sto
i zadarty ma nos
ta dziewczyna.
Kocham się w niej,
o spotkaniach co dzień
przypominam.
Widzę w mych snach,
że już ona i ja
razem wszędzie...
Lecz jak na złość,
nie tak łatwo
spotkać się z nią.

Barbara tu, Barbara tam,
nie trzyma się zegara,
zawsze gdzieś gna!
Dopiero tam, już znowu tu,
wciąż muszę za Barbarą
gonić co tchu!

Stało się już,
przy Barbarze tuż tuż
dni me płyną.
I wierzcie mi,
nie wytrzymałby nikt
z tą dziewczyną.
Dobrze mi tak,
czego chciałem, to mam,
taka ona! A jak na złość,
nie tak łatwo
rozstać się z nią.

Barbara tu, Barbara tam...

Barbara ma pomysłów sto,
pięć rzeczy robi naraz.
Co ja mam z nią!
Barbara tu, Barbara tam,
los chyba mnie pokarał.
Nie wiem już sam
Barbara tu, Barbara tam,
dokuczyć mi się stara.
Dobrze ją znam!
A jednak to prawdziwy skarb,
z Barbarą tylko dla mnie
świat jest coś wart!

КУРЁЗЫ

ГОРА АД РОЗУМУ

Складаная сітуацыя стварылася ў адной з фірм па вытворчасці камп'ютэраў у Сан-Францыска. Дзесяць супрацоўнікаў канструктарскага бюро атрымалі паведамленне ад кіраўніцтва фірмы, што яны звольнены. Яшчэ зусім нядаўна іх лічылі незаменнымі. А цяпер...

Справа ў тым, што з гэтага часу іх работу будзе выконваць электронна-вылічальнае прыстасаванне, створанае ў гэтым жа канструктарскім бюро і пры іх актыўным удзеле. „Нічога не зробіш, — гаворыць карэспандэнту „Інтэрнэшнл геральд трыбюн“ дырэктар фірмы Чарльз Уотсан. — Фірме больш выгадна трымаць камп'ютэр, чым дзесяць высокаплатных супрацоўнікаў. Магчыма, хутка машына звольніць і мяне“.

ЦЫРУЛЬНІКІ — „РЭКАРДСМЕНЫ“

Нядаўна італьянскі цырульнік Амада ўстанавіў „новы сусветны рэкорд“ — пастрыг 200 чалавек за 83 гадзіны няспыннай работы. Гэта не давала спакою яго грэчаскаму калегу Хрыстасу Ангелапуласу. Пасля працяглай падрыхтоўкі ён пабіў рэкорд Амада — за 86 гадзін пастрыг 247 кліентаў. Хацеў пастрыгчы 248-га, але не здолеў. У непрытомным стане „рэкардсмен“ быў дастаўлены ў бальніцу.

1

2

3

Мядзведзь — будаўнік

Мядзведзь наш кіраваў аднойчы трэстам.
Ці на сваім знаходзіўся ён месцы, —
Не ў гэтым сутнасць.
Нешта раз
Быў трэсту дадзены заказ,
Дакладней жа, дык тэрміновае заданне:
Праз рэчку мост пабудаваць.
Здавалася б, чаго тут разважаць,
Будуй з належным спрытам і стараннем,
Але Мядзведзь наш з ранні
Паклікаў да сябе ўсіх на нараду,
Каб, як гаворыцца, усё абмазгаваць —
І мост хутчэй пабудаваць.
Імкнуўся кожны даць свае парады.
— Яно выгодней, —
Сказала Качачка лагодна,
Паважна абапёршыся на хвост, —
З гарапніку узвесці мост,
— Э, не! — сказаў, нібы адсек,
Бабёр — вядомы дрывасек. —
Калі ўжо будаваць, дык толькі з дрэва.
Вунь колькі тут яго — і справа, бач, і злева.
Я нават слова дам,
Што нарыхтую матэр'ялу сам.
Ну, словам, прапаноў было нямала.
Але, здавалася, чагосьці не хапала.
Але чаго?
Ніхто не мог з прысутных зразумець.
І слова тут узяў Мядзведзь:
— Нам трэба вырашыць:
Мост будзем будаваць які?
Уздоўж ці ўпоперак ракі?

*

Дарэчы,
Такое можа здарыцца не толькі каля рэчкі...
Калі дзе трапіцца такі вось будаўнік,
Ён справу завядзе ў тупік.

Уладзімір Правасуд

НАСТРАШЫЎ

— Або ты неадкладна перастанеш піць, або аслепнеш. Выбірай! — сказаў доктар Знахарук Кастусю.

— Разумееце, доктар, я стары чалавек, і мне здаецца, я бачыў ужо практычна ўсё...

НА ШЫРОКІМ СВЕЦЕ

Пажылая ледзі скардзіцца мэру горада, што многія дзяўчыны ходзяць па вуліцах у шортах.

— Што б сказалі людзі, калі б, напрыклад ваша жонка выйшла ў шортах?

— Яны сказалі б, што я ажаніўся не па каханні, а па разліку.

*

Лысаваты кліент пытае ў цырульніка:

— А ці няма ў вас добрага сродка супроць аблысення?

— Ёсць, сінь'ёр. Дасканалы сродак! Цудоўны! Аднаўляе пышную шавялюру.


— А чаму ж вы самі ім не карыстаецеся? — падазрона пытае кліент, косячыся на ззяючую лысіну цырульніка.

— Справа ў тым, што сродак прадае мой памочнік. Бачыце, якія ў яго раскошныя валасы? Такім чынам, мы абое дэманструем, як выглядае галава да ўжывання нашага сродка і пасля.


*

— А зараз вы прымеце ванну, — сказаў наглядчык новаму арыштанту.

— Ванну? Ні за што! У прыгаворы аб гэтым нічога не гаварылася!



Вусы на зіму.



З паляўнічых прыгод.

ЖАХ

Які жахлівы лёс быць другім мужам удавы!

— Značна горш быць першым.

СУЧАСНАЯ БАЙКА

У цёмным лесе жылі сабе тры мядзведзі: мядзведзь-тата, мядзведзіха-мама і мядзведзік-сынок ад першага шлюбу.

НА ЭКЗАМЕНЕ

Прафесар: — Хто пойдзе адказваць першым, атрымае ацэнку на бал вышэй.

Студэнт: — Пане прафесар, стаўце мне тры, я іду.

МІКОЛКА

Бабуся, я хацеў бы Элачку пачаставаць бананам, але баюся.

— А чаго ты баішся, родненькі?

— Забярэ.



Хранічнае захворванне.



...Згубіўшы давер на старой пасадзе, уладкаваўся ў „Стол знаходак“.

ДОБРЫ АПЕТЫТ

„Каму-каму, а прарабу добра вядома, што на выпіўку пайшоў пакост з цэментам, а на закуску фарба і цвікі“.

(З тлумачальнай запіскі будаўніка)



Крытыкаваць недахопы лёгка, рабіць іх куды цяжэй.